КУЛЬТУРА

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 4 (1651) | 26 студзеня 2024 г.

Фота з архіва калектыву, 2021—2023 гады

9 771994 478007 24004

KULTURA-INFO.BY

З глыбінь народных традыцый

Наймацнейшыя выканаўцы, унікальныя праграмы, непаўторныя касцюмы і харэаграфія, што ўвасобіла самыя тонкія грані нацыянальнага танца, заснаванага на глыбіні традыцый. Беларускі дзяржаўны акадэмічны заслужаны харэаграфічны ансамбль "Харошкі" адзначае паўвекавы юбілей.

Працяг тэмы — на стар. 9.

Фота: president.gov.by

Пад знакам якасці

Бяспека, экалагічнасць, інавацыйнасць, тэхналагічнасць, эстэтычнасць — пяць паказчыкаў, спалучэнне якіх будзе вызначаць якасць нашых тавараў і паслуг. У краіне заснаваны Дзяржаўны знак якасці. Адпаведны Указ № 21 падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 18 студзеня.

Дакументам зацверджана выява і апісанне знака. Ён уяўляе сабой пяцівугольнік чырвонага колеру, у цэнтры якога размешчана стылізаваная выява перавернутай літары “К” і надпіс “Беларусь”. Пяць вуглоў сімвалізуюць якасць беларускай прадукцыі, якая дасягаецца спалучэннем пяці паказчыкаў вытворчасці: бяспекі, экалагічнасці, інавацыйнасці, тэхналагічнасці і эстэтычнасці.

Парадак прысваення Дзяржаўнага знака якасці і пералік стымулюючых ільгот і прэферэнцый, якія прадастаўляюцца вытворцам пры яго прысваенні, будзе вызначаны Урадам.

Заснаванне Дзяржаўнага знака якасці паспрыяе павышэнню якасці беларускіх тавараў і паслуг.

Таксама ў краіне зацверджаны Рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні Года якасці. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў № 41 ад 16 студзеня.

Дакумент уключае 69 мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне эканамічнага патэнцыялу Беларусі, забеспячэнне якасных паказчыкаў праз стымуляванне ініцыятывы, фарміраванне асабістай грамадзянскай адказнасці за дасягненне высокай якасці жыцця, інфармацыйнае забеспячэнне Года якасці. Вызначаны іх мэты, механізмы і тэрміны рэалізацыі, а таксама адказныя выканаўцы.

У прыватнасці, плануецца падрыхтоўка і прыняцце шэрагу законаў па забеспячэнні правядзення Года якасці (“Аб акрэдытацыі ў Нацыянальнай сістэме акрэдытацыі”, “Аб змене Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі”, “Аб незалежнай ацэнцы і сертыфікацыі кваліфікацый” і інш.), пашырэнне сеткі цэнтраў падтрымкі тэхналогій і інавацый, перааснашчэнне і мадэрнізацыя вытворчасцей, падтрыманне высокай якасці аўтамабільных дарог, развіццё функцыяналу партала рэйтынгавай ацэнкі арганізацый, забеспячэнне працы грамадскіх прыёмных па прынятцы ад насельніцтва прапаноў аб паляпшэнні якасці жыцця і паслуг.

Акрамя таго, дакументам прадугледжана ўкараненне і шырокае правядзенне конкурсаў наватараў, рацыяналізатарскіх ідэй, прафесійнага майстэрства.

Будуць прыняты меры і для павышэння якасці жыцця ў сельскай мясцовасці праз развіццё сучаснай сацыяльнай, інжынернай і транспартнай інфраструктуры. Плануецца распрацоўка канцэпцыі падрыхтоўкі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця да працоўнай дзейнасці, сямейнага жыцця, іх сацыялізацыі і інтэграцыі ў грамадства.

На сайтах дзяржорганаў, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, устаноў адукацыі будуць створаны раздзелы “Год якасці” з наступным размяшчэннем інфармацыі аб мерапрыемствах Года якасці, адпаведныя агляды з’явяцца і ў сацсетках.

Мяркуецца наладзіць выраб і продаж у рознічным гандлі тэматычнай калекцыі адзення (мерч), прысвечанай вядомым брэндам айчыннай прамысловасці, а таксама арганізацыя цырымоніі ўручэння Дзяржаўнага знака якасці.

Пастанова набыла моц 16 студзеня 2024 года.

Падрабязней — на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь

Помнікі і святы

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 23 студзеня. Дзякуючы сродкам відэасувязі ўдзел у нарадзе прынялі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

На нарадзе абмяркоўваліся пытанні выканання Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы, у тым ліку работ па капітальным рамонце з рэканструкцыяй і рэстаўрацыяй будынка Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, завяршэння распрацоўкі праектнай дакументацыі па рэканструкцыі Яўленскай і Георгіеўскай цэркваў Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра, завяршэння работ на капліцы-пахавальні Ажэшкаў у Закозелі Драгічынскага раёна, паўночна-ўсходняй аркадзе палацавага комплексу Сапегаў у Ружанах Пружанскага раёна, царкве Раства Прасвятой Багародзіцы ў Мураванцы Шчучынскага раёна і паўночна-ўсходнім корпусе замка Сапегаў у Гальшанах Ашмянскага раёна.

Акрамя таго, закраналіся пытанні падрыхтоўкі да правядзення канцэрта-прэзентацыі ў рамках Адзінага дня галасавання ў Вялікім тэатры Беларусі, Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”, мерапрыемстваў да Дня Незалежнасці і 80-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў, свята “Купалле” (“Аляксандрыя збірае сяброў”), Рэспубліканскага свята выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі на рацэ Свіслач у Мінску і IX Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, а таксама арганізацыі ўрокаў гісторыі ў музеях.

Планава і спакойна

Адзіны дзень галасавання на выбарах дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і ў мясцовыя саветы пройдзе ў Беларусі 25 лютага. Зараз электаральная кампанія на стадыі праверкі дакументаў і рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты.

Гэты працэс завершыцца 30 студзеня. А з 31 студзеня па 24 лютага ўключна пройдзе этап агітацыі. Па звестках Цэнтральнай выбарчай камісіі, падрыхтоўка да выбараў ідзе спакойна і планава. Ужо зарэгістравана 4439 нацыянальных наглядальнікаў:

— Але гэта толькі ў тэрытарыяльных акруговых камісіях, — тлумачыць старшыня ЦВК Ігар Карпенка. — Цяпер ідзе працэс фарміравання ўчастковых выбарчых камісій, у агульнай колькасці іх створана 5411. І вядома ж, пры ўчастковых камісіях таксама будуць нацыянальныя наглядальнікі: цяперашняя лічба можа вырасці ў разы.

Па стане на 22 студзеня зарэгістравана 58 міжнародных назіральнікаў. Работу штаба доўгатэрміновых назіральнікаў адкрыла сустрэча Ігара Карпенкі з кіраўніком місіі назіральнікаў ад СНД, генеральным сакратаром СНД Сяргеем Лебедзевым, якая адбылася напярэдадні. Па меркаванні Цэнтрвыбаркама, міжнародных назіральнікаў будзе даволі шмат. Рыхтуецца каля 300 пакетаў дакументаў, каб назіральнікі адчувалі сябе ў Беларусі камфортна і маглі свабодна ўдзельнічаць у працэсе назірання за адзіным днём галасавання.

Наладзіць прафілактыку

Грамадская небяспека і шкоднасць карупцыі відавочныя. І кіраўніцтва краіны паслядоўна прымае меры для ўмацавання законнасці, недапушчэння прасочвання крыміналу ў органы дзяржаўнага кіравання і розныя сферы, у тым ліку культуру.

Законам прадугледжаны санкцыі за карупцыйныя злачынствы, якія па некаторых складах дасягаюць 15 гадоў пазбаўлення свабоды з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю. Атрыманая злачынным шляхам маёмасць падлягае адмысловай канфіскацыі. Пра гэта нагадаў Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь Андрэй Швед падчас нядаўняй сустрэчы з працоўным калектывам аднаго з айчынных прадпрыемстваў.

Па інфармацыі пракуратуры, большасць карупцыйных правапарушэнняў звязана з невыкананнем заканадаўства, што рэгламентуе працэдуры закупак. Акрамя таго, часта выяўляюцца іншыя: выкарыстанне службовымі асобамі ў асабістых мэтах службовай маёмасці дзяржпрадпрыемстваў, невыкананне абмежаванняў па атрыманні падарункаў і іншай маёмасці, няякасная і бессістэмная прафілактычная праца з боку кіраўніцтва.

Між іншым, супрацьдзеянне карупцыі — агульная справа ўсяго грамадства. У рэспубліканскіх органах кіравання меры барацьбы рэалізуюцца праз адмысловыя камісіі. Чарговае пасяджэнне камісіі па супрацьдзеянні карупцыі Міністэрства культуры адбылося 19 студзеня. На нарадзе разгледжана прадстаўленне Генеральнай пракуратуры аб устараненні парушэнняў заканадаўства, прычын і ўмоў, што ім садзейнічаюць.

Па выніках пасяджэння прыняты рашэнні, накіраваныя на ўзмацненне працы па супрацьдзеянні карупцыі і карупцыйных праяўленняў у дзейнасці арганізацый культуры. Звернута ўвага на няўхільнае выкананне заканадаўства ў сферы дзяржзакупак, на актывацыю прафілактыкі.

Анатолій Маркевіч падчас сустрэчы з Аляксандрам Канюком

Як элемент дыпламатыі

Прадстаўляючы Айчыну, рабіць усё для ўмацавання аўтарытэту беларускай дзяржавы на міжнароднай арэне. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 22 снежня павіншаваў работнікаў дыпламатычнай службы краіны з прафесійным святам. Да міжнароднага дыялогу і супрацоўніцтва прычынілася і культурная дыпламатыя.

АРМЕНІЯ: РЫХТУЕМСЯ ДА ДЗЁН КУЛЬТУРЫ

Пытанні арганізацыі Дзён культуры Арменіі ў Беларусі абмеркавалі 24 студзеня ў Міністэрстве культуры. Кіраўнік ведамства Анатолій Маркевіч правёў сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Арменія Аляксандрам Канюком.

Было адзначана, што культурнае супрацоўніцтва як элемент дыпламатыі спрыяе ўмацаванню пазітыўнага іміджу дзяржаў на міжнародным арэне, павышае ўзровень зацікаўленасці да нацыянальных традыцый абедзвюх краін і папулярызацыі іх культуры. Залогам міжнароднага міру з’яўляецца гарманічнае суіснаванне розных культур, дыялог і супрацоўніцтва ў абстаноўцы даверу і ўзаемаразумення.

МАЛДОВА: ПРЫМАЕМ ДАРЫ

Таварыства дружбы Беларусь-Малдова падарыла Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі кнігі, прысвечаныя вывучэнню феномена гагаузскага этнасу, у тым ліку гагаузаў Беларусі — адной з малалікіх і дысперсна пражываючых рэгіянальных груп гэтага этнасу.

У мерапрыемстве ўдзельнічалі генеральны дырэктар Нацбібліятэкі Вадзім Гігін, старшыня таварыства дружбы Беларусь-Малдова Віктар Сарачан, доктар гістарычных навук Лізавета Квілінкова. У яе кнігах разглядаюцца вектары знешнепалітычнай стратэгіі Гагаузіі і культурна-цывілізацыйныя арыенціры, а таксама спосабы захавання культурнай спадчыны.

КІТАЙ: СВЯТКУЕМ НОВЫ ГОД

Урачысты канцэрт “Свята Вясны — 2024”, прымеркаваны да кітайскага Новага года, пройдзе 31 студзеня ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Сёлета для традыцыйнай імпрэзы нумары падрыхтавалі паўсотні кітайскіх студэнтаў і выпускнікоў беларускіх ВНУ. Задзейнічаны і навучэнцы сталічнай гімназіі № 23. Артысты прадэманструюць яркасць і разнастайнасць нацыянальнага і сучаснага мастацтва КНР: музыку і песні, харэаграфічныя і тэатральныя кампазіцыі.

РАСІЯ: ЗБІРАЕМ СЯБРОЎ

Святочны канцэрт “Музыка збірае сяброў”, прымеркаваны да Дня дыпламатычнага работніка Беларусі, зладзілі ў Маскве. Дзелавы і культурны комплекс Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі 25 студзеня стаў творчай пляцоўкай, дзе ўпершыню выступіў народны аматарскі калектыў — аркестр рускіх народных інструментаў Гродзенскага дзяржаўнага музычнага каледжа. Віртуознае выкананне беларусаў паглыбіла гледачоў у цудоўны свет музыкі і атуліла цяплом.

Цёплую імпрэзу зладзіла і Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка сумесна з Арэнбургскім абласным музеем выяўленчых мастацтваў і прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь — Расійскім цэнтрам навукі і культуры ў Мінску. Выстава “Арэнбурская пуховая хустка”, што адкрылася 24 студзеня, будзе саграваць наведвальнікаў да 21 лютага.

ІАРДАНІЯ: КАЛЯДУЕМ ПА-БЕЛАРУСКУ

Нашы традыцыі прыжыліся ў Амане. Падчас зімовых свят беларусы Іарданіі зладзілі Калядкі. Старадаўні абрад прайшоў весела, заўзята, з адмысловымі падарункамі, якія даставілі з роднай зямлі. І дзецям, і дарослым спадабаліся калядныя персанажы, асабліва ўразіла Каза. Удзельнікі дагэтуль з усмешкай успамінаюць, як “пакацілася зорка на Калядкі” ды “падпаліла пяткі”.

Ёсць пуцёўка ў фінал!

Пачатак тыдня быў гарачым для будучых зорак эстрады: 22 і 23 студзеня ў Мінску праходзіў другі этап нацыянальнага адбору на міжнародныя конкурсы “Славянскі базар у Віцебску”.

У праслухоўваннях нацыянальнага адбору, які разгарнуўся ў Маладзёжным тэатры эстрады, выступілі пераможцы рэгіянальных тураў, а таксама прадстаўнікі падпарадкаваных Міністэрству культуры арганізацый. Шлях да XXII Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу “Віцебск” і XXXIII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні “Віцебск”, якія пройдуць у рамках XXXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”, няпросты. Дэманстраваць таленты спевакам давялося ў рэжыме жывога гуку ў суправаджэнні фанаграмы.

У “дарослым” конкурсе спаборнічалі 35 выканаўцаў. Рашэннем экспертнай групы вызначана 10 вакалістаў для ўдзелу ў фінальным этапе. Гэта Віталь Дроб, Ганна Дрозд, Аліса Доўнар, Ганна Дук, Соф’я Мацкевіч, Аляксандра Носаль, Дар’я Чэслаўская, Валерый Чучман, Святлана Хартановіч, Дар’я Юркоўская.

У “дзіцячых” праслухоўваннях суперничалі больш за 30 юных вакалістаў. Для ўдзелу ў фінале нацыянальнага адбору вызначаны 10: Аляксандра Лепяцёнак, Амалія Сухан, Злата Яраш эвіч, Маргарыта Цумарава, Улада Табола, Арына Войценка, Платон Буйноўскі, Лаўра Лагута, Лізавета Цупрык, Ксенія Казлова.

Хто атрымае пуцёўку на “Славянскі базар — 2024”, даведаемся ў другой палове сакавіка.

Для людзей і коней

На апаратнай нарадзе Міністэрства культуры, якая адбылася 16 студзеня, закраналася пытанне аб завяршэнні рэканструкцыі і рэстаўрацыі стайні ў складзе палацава-паркавага комплексу ў Залессі на Смаргоншчыне.

Ён належаў роду Агінскіх — таму самаму, з якога паходзіць аўтар славутага паланэза “Развітанне з Радзімай”. Гэты архітэктурны ансамбль XIX стагоддзя ўключае палац, парк з сажалкамі, дзве альтанкі, капліцу, млын і стайню. Работы ў палацы завершаны ў 2017-м, на аб’ектах у парку — у 2020-м.

Сёння працягваецца рэканструкцыя з рэстаўрацыяй канюшні. Працы пачаліся ў 2018 годзе, прычым адмыслоўцы разабралі і сабралі сцены стайні з тых жа камянёў, дбайна пранумараваных, каб было магчыма аднавіць ранейшы парадак кладкі. Прымяненне будынка не пакідае пытанняў — тут плануецца размясціць коней, дзякуючы якім госці палацавага комплексу і сёння могуць пракаціцца ў карэце па тэрыторыі парку. Частка памяшканняў будзе музеефікавана, у іх з’явіцца экспазіцыя, прысвечаная гаспадарчаму жыццю маёнтка Агінскіх.

Як паведаміла начальнік упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Алена Клімовіч, у стайні былі выкананы дадатковыя работы, спатрэбілася паўторная экспертыза. Пасля гэтага Смаргонскі раённы выканаўчы камітэт накіраваў 150 тысяч рублёў. Сёння падключаецца ацяпленне, вядуцца аддзелачныя работы, і ў лютым аб’ект здадуць. Акрамя таго, 336 тысяч рублёў было выдучана абласной інвестыцыйнай праграмай. На гэтыя сродкі каля сядзібы збудавана стаянка для аўтобусаў — інфраструктура комплексу палепшылася. Агулам на рацы ў стайні было выдучана 815 тысяч рублёў.

У Залессі ладзяцца тэатралізаваныя экскурсіі, урачыстая рэгістрацыя шлюбаў, наведвальнікі могуць пераначаваць у гасцявых пакоях у палацы. За 2023 год ансамбль наведала каля 37 тысяч чалавек, было зароблена 250 тысяч рублёў. Увядзенне ў эксплуатацыю стайні паспрыяе павелічэнню турыстычнага патэнцыялу комплексу і прыцягне ўвагу новых наведвальнікаў.

Будынак на Рэвалюцыйнай вуліцы ў Мінску, дзе размяшчаўся Інстытут беларускай культуры, 1920-я

Працэс перабудовы архікафедральнага касцёла ў Мінску пад Дом фізкультуры, 1950-я. У 1990-х храму вернуты першапачатковы выгляд

Сто гадоў на варце спадчыны

Як у Беларусі развівалася сістэма аховы помнікаў?

Летась споўнілася 30 гадоў са стварэння Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, аднак агулам сістэма ўліку і аховы нацыянальнай спадчыны нашай краіны ахоплівае больш як стагоддзе. За працяглы час заканадаўства ў гэтай сферы прайшло некалькі этапаў развіцця. Аб асноўных вехах распавядае Генадзій Ходар, кансультант упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

ЗДАБЫТАК КРАІНЫ

Пасля ўтварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі 19 студзеня 1919 года быў заснаваны Народны камісарыят асветы БССР, які ўзяў пад апеку помнікі культуры і мастацтва. Было вырашана арганізаваць асобны мастацка-археалагічны пададдзел, асноўнай задачай якога мусіла стаць ахова помнікаў мастацтва і старажытнасці. 30 студзеня 1919 Часовы рабоча-сялянскі ўрад БССР прыняў пастанову "Аб перадачы культурных каштоўнасцей навукі і мастацтва, якія знаходзяцца ў маёнтках і розных установах, Камісарыяту адукацыі і аб арганізацыі іх уліку, аховы і збору".

Мэтанакіраванае вывучэнне культурнай спадчыны Беларусі пачалося пасля 1922 года. Тады быў утвораны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт), спецыяльная камісія якога ўзначаліла краязнаўчы рух у нашай краіне. Сто гадоў таму, 24 снежня 1923, Савет народных камісараў БССР зацвердзіў пастанову "Аб абавязковай рэгістрацыі, прыёме на ўлік і ахове помнікаў мастацтва, даўніны, побыту і мясцовай прыроды". Гэты дакумент быў першым прававым актам, які паклаў пачатак фарміраванню сістэмы ўліку аб'ектаў культурнай спадчыны Беларусі.

Пастановай прадпісвалася сталая дзяржаўная рэгістрацыя і ахова помнікаў мастацтва, старажытнасці, народнага побыту і прыроды, якія знаходзяцца пры арганізацыях і таварыствах ці ў прыватных асоб. Ствараўся спецыяльны орган, адказны за рэгістрацыю такіх помнікаў і выдачу іх уладальнікам асаблівага ахоўнага пасведчання, — навукова-мастацкая экспертная камісія. Яна падрыхтавала план рэстаўрацыі часткова разбураных помнікаў, у тым ліку найбольш даўніх — у Мінску і Полацку.

СТАНАЎЛЕННЕ СІСТЭМЫ

У 1926 годзе Першы Усебеларускі краязнаўчы з'езд акрэсліў задачу — правесці ўлік спадчыны і выратаваць яе ад разбурэння. Камісія Інбелкульта выявіла і апісала шэраг манументальных помнікаў Полацка, Віцебска, Оршы, Магілёва, Слуцка і Мінска, а вынік працы перадала на Урад для абвяшчэння іх нацыянальным здабыткам. Пастанова СНК БССР ад 5 ліпеня 1926-га нацыяналізавала шэраг аб'ектаў мастацтва, архітэктуры, побыту і прыроды, а на акруговыя, раённыя, гарадскія і сельскія саветы ўсклала абавязкі па ахове помнікаў культуры. Гэты дакумент зацвердзіў першы ў Беларусі спіс з 87 аб'ектаў спадчыны. Праз вышэйшыя дзяржаўныя ўстановы камісія правяла акт аб ускладанні аховы помнікаў манументальнай архітэктуры, а таксама гарадзішчаў, курганоў і селішчаў на мясцовыя органы ўлады.

У 1932 годзе пастановай СНК БССР былі рэарганізаваны дзяржаўныя ўстановы па ахове помнікаў. Пры Наркамасветы ствараўся Міжведамасны камітэт па ахове помнікаў матэрыяльнай культуры ў БССР. Пасля далучэння Заходняй Беларусі ў 1939-м быў прыняты шэраг пастаноў Урада, што тычыліся культурнай спадчыны гэтых рэгіёнаў, у тым ліку пастанова "Аб ахове ў заходніх абласцях БССР помнікаў рэвалюцыі, мастацтва ды даўніны і захаванні архіваў". Згодна з дакументам, забаранялася разбурэнне помнікаў, рабаванне маёнткаў і знішчэнне архіваў, а таксама вываз мастацкіх каштоўнасцей без дазволу Савета народных камісараў БССР. Тады ж была створана і ўрадавая камісія па ахове помнікаў гісторыі, рэвалюцыі, Грамадзянскай вайны, архітэктуры і мастацтва. Разам з тым у даваенны перыяд закрытыя сакральныя пабудовы і колішнія сядзібы прыстасоўваліся пад гаспадарчыя патрэбы ці культурныя ўстановы, а часта проста разбураліся.

АДНАЎЛЕННЕ

У гады Вялікай Айчыннай вайны і гітлераўскай акупацыі беларуская гісторыка-культурная спадчына панесла цяжкія страты. Новы этап фарміравання дзяржаўных органаў яе аховы пачаўся ў пасляваенны перыяд. З 1944-га два ведамствы курыравалі помнікі гісторыі і культуры: Наркамасветы БССР і Галоўнае ўпраўленне па справах архітэктуры пры СНК БССР. У гэтым упраўленні быў арганізаваны аддзел па ахове помнікаў архітэктуры, у кампетэнцыі якога ўваходзіла навукова-даследчая работа, улік, ахова і рэстаўрацыя найбольш важных аб'ектаў. Тады ж пры аддзеле арганізавалі Інспекцыю па ахове помнікаў архітэктуры, якая дзейнічала да 1959 года.

Паралельная структура з адпаведнымі ахоўнымі функцыямі існавала ў Наркамасветы БССР. Спачатку ў ведамстве стварылі два адмысловыя ўпраўленні: па музеях і па бібліятэках. Пастановай СНК БССР ад 24 красавіка 1945 года № 870 быў заснаваны Камітэт па справах культурна-асветных устаноў на правах рэспубліканскага камісарыята, якому перадаваліся функцыі кіравання музеямі, бібліятэкамі і іншымі культурна-асветнымі арганізацыямі. У пачатку 1950-х у гэтым камітэце быў створаны аддзел аховы помнікаў гісторыі і культуры.

ЛІКВІДАЦЫЯ НЕДАХОПАЎ

У 1945-м зацверджана пастанова СНК БССР "Аб ахове і аднаўленні гістарычных і архітэктурных помнікаў". Яшчэ адзін важны заканадаўчы акт — пастанова Савета Міністраў СССР "Аб мерах паляпшэння аховы помнікаў культуры" прыняты 14 верасня 1948 года. Дакумент апісваў сур'ёзныя недахопы ў ахове спадчыны: адсутнасць кантролю за захаванасцю гістарычных і археалагічных помнікаў, нездавальняючае кіраўніцтва аховай і рэстаўрацыяй архітэктурных помнікаў з боку Камітэта па справах архітэктуры і Камітэта па справах мастацтваў пры Савеце Міністраў СССР, а таксама адсутнасць належнага забеспячэння захаванасці помнікаў культуры.

Пастанова абавязала Камітэт па справах архітэктуры і Камітэт па справах мастацтваў пры Савеце Міністраў СССР узмацніць кіраўніцтва і кантроль у справе ўліку, аховы, рэстаўрацыі і выкарыстання помнікаў архітэктуры і мастацтва. Далейшая нарматыўная прапрацоўка дакумента ажыццяўлялася ў рамках зацверджанага ім Палажэння аб ахове помнікаў культуры, якое вызначыла паўнамоцтвы цэнтральных і мясцовых органаў улады ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Кіраўніцтва пастаноўкай на ўлік, аховай, рэстаўрацыяй і выкарыстаннем помнікаў, а таксама кантроль гэтых аспектаў ускладаліся на камітэты па справах культурна-асветных устаноў пры Саветах Міністраў саюзных рэспублік — па археалагічных і гістарычных помніках, на Камітэт па справах архітэктуры пры Савеце Міністраў СССР — па помніках архітэктуры і мастацтва. Непасрэдную работу ажыццяўлялі мясцовыя органы ўлады. Пастанова мела на мэце перш за ўсё на ўдасканаленне парадку ўліку і рэгістрацыі помнікаў культуры. У сувязі з гэтым былі прыняты ўрадавыя меры па арганізацыі ўліку і пашпартызацыі архітэктурных, археалагічных помнікаў. Распрацоўваліся спецыяльныя інструкцыі па ўліку.

СКЛАДАННЕ СПІСАЎ

Саветы Міністраў саюзных рэспублік, Камітэт па справах архітэктуры і Камітэт па справах мастацтваў пры Савеце Міністраў СССР абавязаны былі правесці ў 1948—1949 гадах улік усіх выяўленых да гэтага часу аб'ектаў спадчыны, якія падлягаюць унясенню ў дзяржаўныя спісы помнікаў культуры. Гэтыя рэестры складаліся выканкамамі на падставе Інструкцыі аб парадку ўліку, рэгістрацыі і ўтрымання помнікаў мастацтва, зацверджанай Камітэтам па справах мастацтва пры Савеце Міністраў СССР 2 сакавіка 1949, і Інструкцыяй аб парадку ўліку, рэгістрацыі, утрымання і рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры, зацверджанай Камітэтам па архітэктуры пры Савеце Міністраў СССР 8 сакавіка 1949. У выніку на тэрыторыі БССР спісы помнікаў археалогіі і гісторыі фіксаваліся пастановай Савета Міністраў БССР № 1629 ад 19 снежня 1950 года.

У дадатках да гэтага заканадаўчага акта вызначаліся канкрэтныя аб'екты саюзнага (32) і рэспубліканскага (198) значэння (з іх 127 археалагічных і 71 гістарычны). Помнікамі саюзнага значэння абвясцілі, напрыклад, Дом-музей І з'езда РСДРП у Мінску, мемарыял у гонар герояў вайны 1812 года ў Кобрыне, Курган Бессмяротнасці ў памяць пра Адама Міцкевіча ў Навагрудку. Помнікі архітэктуры былі ўзяты на дзяржаўны ўлік і ўнесены ў асобныя спісы на падставе пастановы Савета Міністраў БССР № 625 ад 18 мая 1953 года. Такіх аб'ектаў аказалася 82: Мірскі замак, былы замак Радзівілаў у Нясвіжы, руіны замка ў Навагрудку, Камянецкая вежа, Косаўскі замак, палац Сапегаў у Ружанах, палац губернатара і ратуша ў Віцебску, палац Румянцавых і Паскевічаў з паркам у Гомелі, Каложская царква ў Гродне, храм абаронная тыпу ў Сынкавічах і Сафійскі сабор у Полацку.

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ

Перабудова сістэмы дзяржаўнай аховы і абароны культурнай спадчыны пачалася неўзабаве. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 8 мая 1953 года было створана Міністэрства культуры БССР. У 1957-м ведамства стала кіраваць аховай помнікаў, якую раней каардынавала ўпраўленне па справах музеяў і аховы помнікаў. Цэнтралізаванае кіраўніцтва аховай і абаронай помнікаў Міністэрства культуры БССР ажыццяўляла праз абласныя ўпраўленні культуры, раённыя і гарадскія аддзелы культуры.

У 1957 годзе пастановай Савета Міністраў БССР зацвярджаецца дадатковы спіс гістарычных (483) і археалагічных (131) помнікаў. Так, былі ўзяты пад дзяржаўную ахову брацкія магілы, бюсты герояў Другой сусветнай вайны і зноў выяўленыя археалагічныя аб'екты. У цэлым да сярэдзіны 1960-х практычна ўся работа спецыялістаў па ахове помнікаў заключалася ў добраўпарадкаванні брацкіх магіл і іншых мясцін, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, аб'екты палацава-паркавага мастацтва і сакральнай архітэктуры разбураліся.

ПАДРЫХТОЎКА ЗБОРУ

У 1967 годзе ЦК КПБ і Урад БССР прымаюць сумесную пастанову, якая прызнае дзяржаўную палітыку ў сферы аховы помнікаў нездавальняючай. На калегіі Міністэрства культуры СССР і Прэзідыума Акадэміі навук СССР 2 кастрычніка 1967 было вырашана падрыхтаваць Збор помнікаў. Першы беларускі закон у сферы спадчыны — "Аб ахове помнікаў культуры" зацвярджаецца 28 снежня 1969 года. Ён увёў класіфікацыю аб'ектаў, якія трэба ўзяць пад ахову дзяржавы: помнікі гісторыі, помнікі архітэктуры, помнікі мастацтва і помнікі археалогіі.

Згодна з дакументам яны былі падзелены на агульнасаюзныя, рэспубліканскія і мясцовыя. У адпаведнасці з класіфікацыяй, прынятае аб'ектаў пад ахову ажыццяўлялася Саветамі Міністраў СССР, БССР, выканкамамі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў. Такім чынам, заканадаўчы акт вызначыў дзяржаўныя органы, якія сваімі рашэннямі зацвярджалі спісы помнікаў.

САНКЦЫІ ЗА ПАРУШЭННІ

За выкарыстанне аб'ектаў спадчыны Саветам Міністраў БССР была ўстаноўлена спецыяльная арэндная плата. Праекты рэстаўрацыі мусілі ўзгадняцца ў Міністэрстве культуры БССР. Пры руйнаванні або перабудове помнікаў закон прадугледжваў абавязковы ўдзел Акадэміі навук БССР і Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры ў вывучэнні і фіксацыі аб'екта (абмеры, раскопкі, фотафіксацыя, выкананне чарцяжоў і іншае), а выдаткі на гэтыя работы аплачвалі ўстановы, якія атрымлівалі дазвол на руйнаванне ці перабудову.

Раскопкі археалагічных помнікаў рэспубліканскага і мясцовага значэння дапускаліся толькі пры наяўнасці адкрытага ліста, які выдаваўся Акадэміяй навук БССР і рэгістраваўся ў Міністэрстве культуры БССР, а помнікаў агульнасаюзнага значэння — у парадку, які акрэслівала заканадаўства СССР. Асноўным недахопам гэтага закона было вельмі нізкае спагнанне за парушэнне. Напрыклад, штраф за разбурэнне помніка складаў 50 рублёў для фізічных і 100 рублёў для юрыдычных асоб.

ГОРАДАБУДАЎНІЦТВА

У 1971 годзе выйшла пастанова Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах будаўніцтва і калегіі Міністэрства культуры БССР "Аб зацвярджэнні спіса гарадоў і іншых населеных пунктаў БССР, якія маюць архітэктурныя помнікі, горадабудаўнічыя ансамблі і комплексы — помнікі нацыянальнай культуры, а таксама прыродныя ландшафты і старажытныя культурны пласт зямлі, які прадстаўляе археалагічную і гістарычную каштоўнасць". Такім чынам упершыню нарматыўна замацоўвалася сучаснае паняцце помніка горадабудаўніцтва. У 1976-м быў прыняты Закон СССР "Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры".

У адпаведнасці з саюзным заканадаўствам у Беларусі пачалася работа па падрыхтоўцы новага закона аб ахове спадчыны. Да сярэдзіны 1978 года быў прыняты Закон БССР "Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры". Ён вызначаў асноўныя прынцыпы ўліку, класіфікацыі і аховы ўсіх аб'ектаў спадчыны на тэрыторыі Беларусі, а таксама кампетэнцыі рэспубліканскіх і мясцовых органаў па пытаннях кіравання і кантролю, закладваў навукова-метадалагічныя асновы рэстаўрацыйнай дзейнасці.

ПРАВІЛЫ І АДКАЗНАСЦЬ

Прадметам аховы абвяшчаліся помнікі гісторыі і культуры — культурныя каштоўнасці, якія знаходзіліся пад аховай дзяржавы. Выкарыстанне помніка ў гаспадарчых мэтах дапускалася, толькі калі не наносіла ніякай шкоды яго захаванасці. З мэтай аховы нерухомых помнікаў паблізу іх павінны былі вызначацца зоны аховы (ахоўная, зона рэгулявання забудовы і зона ахоўнага ландшафту). Законам прадугледжваўся парадак правядзення археалагічных раскопак і разведак. Раскопкі без дазволу забараняліся, для іх арганізацыі выдаваўся адкрыты ліст.

Асобы, вінаватыя ў невыкананні правіл аховы, выкарыстання, уліку і рэстаўрацыі помнікаў, неслі крымінальную, адміністрацыйную ці іншую адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам.

У рамках рэалізацыі новага закона на пасяджэнні Савета Міністраў БССР у 1980 годзе было заслухана пытанне аб мерах па паляпшэнні аховы, рэстаўрацыі і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры ў Беларусі. У пастанове, прынятай па гэтым пытанні, Савет Міністраў адзначаў, што ў праектах генеральных планаў гарадоў і населеных пунктаў не заўсёды ўлічвалася роля помнікаў, прапаноўвалася руйнаванне будынкаў, якія маюць гістарычную і культурную каштоўнасць, недацэньвалася іх прыродна-ландшафтнае асяроддзе, слаба вялася работа па захаванні і рэгенерацыі забудовы старажытных цэнтраў такіх гарадоў, як Гродна, Навагрудак, Нясвіж, Полацк і іншыя.

Наспявала патрэба ў новых рашэннях у сферы аховы помнікаў — аб яе далейшым развіцці мы распавядзём у наступных нумарах.

Антон РУДАК
Фота з архіваў

Сабор Святых Пятра і Паўла ў Мінску, рэстаўраваны ў 1970-х

Сафійскі сабор у Полацку, 1930-я

Так выглядала ў 1930-я Дабравешчанская царква ў Віцебску. Яе ўзарвалі ў 1961 годзе і аднавілі ў 1990-х

Традыцыі: дзеля яднання і развіцця

Зацвярджэнне Канцэпцыі развіцця нацыянальнай культурнай прасторы ва ўсіх сферах жыцця грамадства на 2024—2026 гады сталася адной з найважнейшых падзей апошняга часу. "К" працягвае збіраць меркаванні пра актуальнасць дакумента і напрамкі яго рэалізацыі.

Як адзначыла начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры **Ірына Карповіч**, Канцэпцыя выявілася вельмі глыбокім ідэалагічным дакументам, які ахоплівае шырокі спектр дзейнасці.

— Важна, што, арыентуючыся на спадчыну, не адмаўляючыся ад добрай класікі, мы канцэнтруем усё найлепшае, што ствараецца ў дадзены момант. Мы звяртаем увагу на работы нашых сучасных артыстаў, пісьменнікаў, музычных дзеячаў, — падкрэсліла Ірына Карповіч. — Таксама варта памятаць, што кожны з нас сёння піша гісторыю, кожны робіць унёсак у фарміраванне нацыянальнай культурнай прасторы. А гэта значыць, кожны мусіць рабіць максімум на сваім працоўным месцы, каб наш час увайшоў у гісторыю беларускай дзяржаўнасці як этап развіцця.

АЙЧЫННЫЯ ШЭДЭЎРЫ — РЭГІЁНАМ

Важнымі напрамкамі рэалізацыі Канцэпцыі з'яўляюцца захаванне і папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама прасоўванне і развіццё нацыянальнага мастацтва. Значную ролю ў гэтай справе адыгрываюць музеі. Нацыянальны мастацкі сёння валодае найбуйнейшай у свеце калекцыяй беларускага мастацтва. Яго зборы налічваюць звыш 33 тысяч адзінак, якія паходзяць з розных пунктаў планеты і храналагічна ахопліваюць каля 12 стагоддзяў гісторыі.

Намеснік генеральнага дырэктара па навуковай і асветніцкай рабоце Нацыянальнага мастацкага музея **Вікторыя Кузьміна** ўпэўнена, што ў цяперашні час асабліва востра адчуваецца неабходнасць захавання традыцыйных каштоўнасцей і нацыянальнай культуры, надання ім новага гучання. Па словах прадстаўніцы ўстановы, у рамках рэалізацыі Канцэпцыі запланаваны шэраг культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў для шырокай аўдыторыі.

— Аддаючы даніну памяці героям Вялікай Айчыннай вайны, музей далучыцца да святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З мэтай папулярызацыі нацыянальнага мастацтва, а таксама падзей і асоб, што зрабілі значны ўклад у станаўленне дзяржаўнасці, адбудуцца персанальныя выставы выдатных айчынных мастакоў-юбіляраў. Плануецца ўцягненне дзіцячай аўдыторыі. Упершыню будзе арганізавана экспазіцыя, інтэрактыўная праграма, экскурсіі і майстар-класы, прысвечаныя гісторыі нацыянальных свят, — паведаміла Вікторыя Кузьміна.

У Канцэпцыі вызначаны механізмы і для культурнага развіцця рэгіёнаў. У сувязі з гэтым упершыню запланавана рэалізацыя перасоўнага выставачнага праекта "Шэдэўры беларускага жывапісу з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея". Для прадугледжанага дакументам уцягнення адрэсатаўраваных і закансерваваных гісторыка-культурных каштоўнасцей у культурны і турыстычны ўжытак адной з прыярытэтных задач стане павелічэнне колькасці рэстаўрацыйных работ.

Для пашырэння міжнароднага супрацоўніцтва запланаваны шэраг праектаў у музеях Расійскай Федэрацыі, а таксама падрыхтоўка выдання, прысвечанага творам мастацтва Кітая з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

НАША ВІЗІТОЎКА НА МІЖНАРОДНЫМ УЗРОЎНІ

Сярод іншага, у Канцэпцыі нададзена ўвага захаванню, памнажэнню і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны, нацыянальных традыцый і звычаяў. Гэта паспрыяе ўстойлівому развіццю нацыянальнай культурнай прасторы, умацаванню прэстыжу дзяржавы ў міжнародным супольнасці. І ў гэтым кірунку ўжо зроблена нямала.

Як адзначае намеснік начальніка ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры **Марыя Нецвятаева**, актыўная праца ў галіне нашых матэрыяльных і нематэрыяльных набыткаў закладвае падмурак для добрай прэзентацыі краіны на міжнародным узроўні.

Па словах Марыі Валянцінаўны, у 2024 годзе UNESCO мусіць разгледзець пытанне ўключэння ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларускага мастацтва выцінанкі. Таксама падрыхтавана і накіравана ў міжнародную арганізацыю дасье па неглюбскай народнай тэкстыльнай традыцыі. Зараз Мінскі аблвыканкам рыхтуе дакументы па элеменце "Культура беларускай дуды". Ідзе рупная дзейнасць і па матэрыяльных аб'ектах. У папярэднім спісе UNESCO ўжо знаходзяцца гродзенская Каложская царква, а таксама аб'екты сакральнай архітэктуры абарончага тыпу: цэрквы ў Сынкавічах і Мураванцы, касцёл у Камаях. Рыхтуецца да вяртання ў гэты пералік Брэсцкая крэпасць.

ЦІ З'ЯВЯЦЦА НОВЫЯ МЕЛЕЖЫ І ШАМЯКІНЫ?

Начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі **Уладзімір Андрыевіч** адзначае важнасць міжведамаснага і міжгаліновага ўзаемадзеяння, грамадска-дзяржаўнага партнёрства. На думку Уладзіміра Уладзіміравіча, Канцэпцыя тычыцца не толькі тэатральнай ці музейнай прасторы, а ўсіх сфер нашага жыцця, бо на фарміраванне асобы ўплывае мноства фактараў: напрыклад, сямейнае выхаванне і культура чытання.

У межах рэалізацыі Канцэпцыі чакаюцца новыя адметныя творы, што паспрыяе кансалідацыі грамадства і фарміраванню патрыятызму. І на падтрымку літаратурнага працэсу накіравана дзейнасць Міністэрства інфармацыі, Саюза пісьменнікаў Беларусі. Важным апірышчам Уладзімір Андрыевіч называе Нацыянальную літаратурную прэмію.

Шмат увагі ў краіне надаецца ўзрошчванню маладых талентаў. Прыкладам такога клопату служыць рэспубліканскі літаратурны стартап LitUP. Ён мае на мэце пошук, падтрымку і прасоўванне перспектыўных беларускіх аўтараў. Паўдзельнічаць могуць як прафесіяналы з важкай біяграфіяй, так і пачаткоўцы. Колькасць заявак на стартап штогод расце, а за час існавання ініцыятывы ў вядучых выдавецтвах нашай рэспублікі пабачылі свет больш за 40 кніг пераможцаў LitUP.

НАВУКА ДЛЯ ШЫРОКАЙ АЎДЫТОРЫІ

На патэнцыял міжведамаснага і міжгаліновага супрацоўніцтва паказвае вялікая цікавасць да Канцэпцыі з боку навукоўцаў. Намеснік дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі **Аляксандр Бараноўскі** зазначыў, што ў рэалізацыі новага дакумента будуць задзейнічаны розныя структуры Нацыянальнай акадэміі навук.

Прыкладам, Інстытут філасофіі сёлета прэзентуе новыя выданні ў серыі, прысвечанай традыцыйнаму светапогляду беларусаў. Ранейшыя кнігі з гэтага шэрагу карыстаюцца попытам у кнігарнях і бібліятэках. Акадэмічныя ўстановы запланавалі тэматычныя канферэнцыі, семінары, лекцыі, дыялогавыя пляцоўкі. Іх асноўнай аўдыторыяй мусяць стаць студэнты і школьнікі, настаўнікі, работнікі ўстаноў культуры і іншыя зацікаўленыя. Задуманы адмысловыя праекты ў супрацоўніцтве з Беларускай праваслаўнай царквой.

Алесь ДАНІЛОВІЧ
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Сумленна, годна і з душой

Нацыянальная студыя "Беларусьфільм" і расійская кампанія "Ваенфільм" рыхтуюцца да запуску сумеснага кінапраекта. Карціна распавядзе пра Героя Савецкага Саюза Міная Шмырова.

Падчас падпісання дамовы

ДАМОВІЛІСЯ

Дагавор аб намеры зняць сумесную стужку быў падпісаны з "Ваенфільмам" у асобе дырэктара ўстановы **Ігара Угольнікава** ў рамках XXIX Мінскага міжнароднага фестывалю "Лістапад". Тады генеральнаму дырэктару "Беларусьфільма" **Юрыю Аляксею** ўручылі першы варыянт сцэнарыя. А ўжо ў студзені гэтага года прайшло чарговае пасяджэнне Савета па развіцці кінематаграфіі пры Міністэрстве культуры з удзелам **Анатоля Маркевіча**. Падчас сустрэчы міністр звярнуў увагу на важнасць стварэння ваенна-патрыятычнай карціны да 80-годдзя Перамогі і адзначыў вялікую працу над сцэнарыем: былі ўлічаны ўсе прапановы, выказаныя на папярэднім пасяджэнні савета ў снежні 2023-га.

НА СВЯТОЙ ЗЯМЛІ

Беларуска-расійскі фільм атрымае назву "Бацька Мінай: Партызанская легенда". Аўтар сцэнарыя народны артыст Расіі Ігар Угольнікаў падчас выступлення перад саветам падкрэсліў, што адчувае вялікае натхненне, бо пачынае здымкі фільма менавіта ў Беларусі, краіне, якую лічыць святой зямлёй і другім домам.

— Вопыт працы з "Беларусьфільмам" над сумесным праектам "Брэсцкая крэпасць" для мяне каштоўны. З той пары, а прайшло ўжо 15 гадоў, ваша кінастудыя змянілася, — кажа Ігар Угольнікаў. — Я ўпэўнены, што агульныя намаганні "Ваенфільма" і "Беларусьфільма" дадуць добры вынік. Вельмі зацікаўлены ў тым, каб большасць акцёраў у карціне былі беларусамі. Я на гэтым настойваю. Са свайго боку мы дапаможам ваеннай тэхнікай, адмыслоўцамі, выкарыстаем здымачныя пляцоўкі кінапарку "Маскіно", кампаніі "Ваенфільм" і, безумоўна, "Беларусьфільма". Поствытворчасць — гук і мантаж — даверым беларускім спецыялістам, а камп'ютарную графіку падзелім пароўну.

САМАЕ ІСТОТНАЕ

Што да ідэйнага зместу праекта, Ігар Станіслававіч адзначае: самае істотнае ў кінааповедзе пра Міная Шмырова — цяжкі выбар. З ім сутыкнецца галоўны герой, што перажыў трагедыю, але знайшоў сілы працягнуць барацьбу супраць фашыстаў. Духоўная моц такіх персанажаў, як Бацька Мінай, стала трывалым падмуркам, дзякуючы якому была здабыта перамога. І казаць пра падобныя старонкі ў гісторыі Вялікай Айчыннай варта. Іншая справа — з якой інтанацыяй.

— У сюжэтах ваенна-патрыятычных фільмаў трэба быць максімальна дакладнымі, — лічыць Ігар Угольнікаў. — Нават нашы дзеці, не ведаючы падрабязнасцей ліхалецця, інтуітыўна счытваюць хлусню. У нашых дзяцей у крыві — праўда пра Вялікую Айчынную. Таму неабходна імкнуцца ствараць кіно сумленна, годна і з душой — і глядач успрыме карціну належным чынам.

Работа над праектам "Бацька Мінай: Партызанская легенда" пачнецца ўжо вясной. На вялікія экраны стужка выйдзе ў 2025-м — да 80-годдзя Вялікай Перамогі.

Яўгенія ГАБЕЦ

У юбілейны год вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў часопіс "Мастацтва" распачынае адразу два праекты, прымеркаваныя да светлай даты.

Новы год — новыя тэмы

Адзін з іх — "За дзень наступны ўсёя зямлі" — сумесны, ініцыяваны рэдакцыйна-выдавецкай установай "Культура і мастацтва". Нашы партнёры — Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў. Падрабязнасці — у №1 "Мастацтва" (студзень).

Другі — аўтарскі мастацтвазнаўцы Барыса Крэпака. "Яны змагаліся за Радзіму" — так Барыс Аляксеевіч назваў свой праект пра ваенныя лёсы мастакоў: франтавікоў, партызан і падпольшчыкаў. Першы артыкул прысвечаны Герою Савецкага Саюза Міхаілу Зялёнкіну, афарміцелю Мінскага мастацка-вытворчага камбіната.

Таксама ў свежым нумары "Мастацтва":

■ Міхась Раманюк — этнограф, мастацтвазнаўца, мастак па касцюме і фотамастак — быў адным з заснавальнікаў і першым галоўным рэдактарам нашага часопіса, а таксама выкладчыкам Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. Даніну памяці да 80-годдзя з яго дня нараджэння аддаў прафесар кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Вячаслаў Іваноўскі.

■ Працягваем дыялог з лаўрэатамі Нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва. Гэтым разам суразмоўцай Дар'і Герасімовіч стала Марта Шчэрбіч, пераможца ў намінацыі "Творчы дэбют".

■ Магілёўская абласная арганізацыя Беларускага саюза мастакоў адзначыла 50-годдзе выставай "Высокае неба Прыдняпроўя" ў музеі імя Паўла Масленікава. На яе запрашае аглядальнік Пётра Васілеўскі.

■ Святлана Раманава знаёміць з майстрам тонкага лірычнага пейзажу Дзмітрыем Мшарам.

■ У Нацыянальным мастацкім музеі размешчана экспазіцыя, прысвечаная 190-годдзю беларускага жывапісца XIX веку Апалінарыя Гараўскага. Настасся Касцюковіч гутарыць з куратарам выставы Юліяй Лісай пра творчы здабытак майстра.

■ Мастацтвазнаўца Надзея Усава чытае паэзію ліній жыцця і творчасці мастачкі-кераміста Ніны Кухарэнка, удавы народнага мастака Беларусі Аляксандра Кішчанкі.

■ Аглядальнік Надзея Бунцэвіч дзеліцца з чытачамі падарункамі XIII Мінскага міжнароднага Каляднага оперныя форуму, што праходзіў у Вялікім тэатры Беларусі.

■ Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Таццяна Траццяк у Год міру і стварэння разам з калегамі — прадстаўнікамі Вялікага тэатра Беларусі — на грант Прэзідэнта ў сферы культуры ажыццявіла праект "Край прыгожых людзей". Вольга Савіцкая гутарыць са спявачкай і педагогам пра паспяховую ініцыятыву, тэатр, музыку і прафесію.

■ На канец мінулага года прыпалі шматлікія гастролі расійскіх тэатраў: Вялікага з Масквы, Дзяржаўнага драматычнага тэатра на Васільеўскім і "Камедыянтаў" з Санкт-Пецярбурга, а таксама Разанскага абласнога тэатра драмы. Чым яны здзіўлялі — у артыкуле Надзеі Бунцэвіч.

■ Тэатразнаўца Юрый Іваноўскі запрашае ў Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа. Тут зноў звярнуліся да драматургіі Мальера і ўвасобілі п'есу "Нібыта хворы".

■ У Беларускім дзяржаўным тэатры лялек паставілі першы бэбі-спектакль — "Матылькі". На ім пабывала Яўгенія Бачыла, якая ўпэўнена, што гэтае прадстаўленне можа захапіць гледача любога ўзросту.

■ Чарговы сеанс ад кіназнаўцы Наталлі Сцяжко нагадвае пра фільм рэжысёраў Маргарыты Касымавай і Івана Паўлава "Глыбокая плынь" паводле твораў народнага пісьменніка Івана Шамякіна.

Будзем разам!

Гучаць стаўбцоўскія фанфары

Аркестр "Віціны" падчас парада ў гонар 430-годдзя горада Стоўбцы, 2023

Народны духавы аркестр "Віціны" са Стаўбцоўскай дзіцячай школы мастацтваў 19 снежня быў уганараваны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта за значны ўклад у выхаванне творчай моладзі, актыўны ўдзел у грамадска-культурных праектах. У заслужаным аматарскім калектыве Рэспублікі Беларусь выступаюць артысты рознага ўзросту, але іх аб'ядноўвае любоў да музыкі і радзімы. Што яшчэ спрыяе поспеху — расказвае кіраўнік аб'яднання Аляксандр Нічыпаровіч.

— Аляксандр Анатольевіч, мабыць, пачнём з гісторыі?

— Духавы аркестр створаны ў Стаўбцоўскім раённым доме культуры ў 1956 годзе. За поспехі ў развіцці аматарскай мастацкай творчасці ў 1988-м калектыву прысвоена званне "народны". У 1990-м аб'яднанне здолела стаць лаўрэатам Усесаюзнага фестывалю-конкурсу духавой музыкі, у 1995-м — адзіным прадстаўніком Беларусі на марш-парадзе духавых аркестраў у Маскве на Краснай плошчы, прысвечаным 50-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Туды мы паехалі не ўсім складам: думалі, што трэба выступіць дзесьці на вуліцы. Але высветлілася, што будзем маршыраваць і граць поруч з іншымі аркестрамі свету. Дзякуючы гэтаму фестывалю мы сустрэлі калег з розных краін — стасункі падтрымліваем і сёння.

— Давайце пагаворым пра рэпертуар. У якіх напрамках працуеце і як падбіраеце творы?

— Аркестр "Віціны" выконвае мелодыі розных кірункаў, што падабаюцца ўсім: джаз, класічную музыку, народную. Мы не проста даём канцэрты, а робім шоу. Дапамагаюць салісты, якія працуюць і навучаюцца ў нашай школе мастацтваў. Не абыходзіцца і без узорнага ансамбля мажарэтак "Феерыя", які ўпрыгожвае выступленні і ездзіць з намі на ўсе конкурсы. Таксама супрацоўнічаем з танцорамі Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў.

Пасля канцэртаў люблю размаўляць з гледачамі: цікаўлюся, якія творы спадабаліся. Мы імкнёмся прынесці задавальненне не толькі людзям сталага ўзросту, але і моладзі.

— Якім чынам можна трапіць у ваш калектыў? Як праходзіць адбор?

— Усё пачынаецца са звычайных заняткаў. Больш паспяховых вучняў запрашаем у дзіцячы аркестр. Яны з чацвёртага класа музыкай школы два разы на тыдзень наведваюць рэпетыцыі і набіраюцца вопыту. Потым найлепшыя хлопчыкі і дзяўчынкі трапляюць у старэйшую групу. Вядома, каб граць у асноўным складзе, неабходна мець добрую падрыхтоўку. Сярод нашых артыстаў як 14-гадовыя юнакі, так і тыя, хто больш за тры дзесяцігоддзі працуе ў калектыве. Ёсць дынастыі: дзядуля і ўнук, бацька і дачка, муж і жонка, якіх мы і звялі. Кожны сезон аркестр абнаўляецца, прыходзяць маладзейшыя ўдзельнікі, якія прысвячаюць сябе музыцы.

— У спісе вашых дасягненняў шмат узнагарод. Ці можаце вылучыць самыя важкія?

— Наш аркестр быў адзначаны пяццю заахвочвальнымі прэміямі і адной Гранд-прэміяй спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, Гранд-прэміяй фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва. Дзякуючы гэтаму мы закупілі якасную апаратуру і інструменты, новыя касцюмы. Сёння "Віціны" — адзін з найлепшых аркестраў па аснашчанасці сучаснымі інструментамі. Самыя важныя для нас перамогі ў конкурсах, фестывалях на тэрыторыі Беларусі.

А першыя ўзнагароды звязаны з савецкім часам: калектыў удзельнічаў у шматлікіх музычных спаборніцтвах і заўсёды вяртаўся з прызавымі месцамі. Мы ездзілі на Усесаюзны фестываль народнай творчасці (1972), фестываль народнай творчасці (1991), рэспубліканскі агляд-конкурс "Мінск-90", абласны конкурс духавых аркестраў (1988), тэлевізійную праграму "Вас выклікае Спартландыя" (1994). Менавіта ў тыя гады аркестр сталі заўважаць.

Мы пабывалі ў розных краінах, вывучалі замежны вопыт — даведваліся пра розныя спосабы правядзення заняткаў, метады адбору дзяцей. У такіх турнэ мы не толькі выступалі і паказвалі сябе, але і глядзелі на калег, пераймалі найлепшае.

А ў 2015-м паўдзельнічалі ў конкурсе творчых калектываў Мінскай вобласці "Напеў зямлі маёй". Мы заваявалі Гранпры і атрымалі мікрааўтобус, на якім ездзім на шматлікія выступленні.

Намагаемся ўдзельнічаць у музычных спаборніцтвах не толькі афлайн, але і анлайн — таксама займаем прызавыя месцы. Мы лаўрэаты першай ступені XVII Абласнога фестывалю народнай творчасці "Напеў зямлі маёй" (Мар'іна Горка, 2021), лаўрэаты другой ступені Міжнароднага фестывалю духавой музыкі "Беларускія фанфары" (Баранавічы, 2022), лаўрэаты першай ступені XXVIII Адкрытага абласнога фестывалю духавой музыкі "Майскі вальс" (Старыя Дарогі, 2022), уладальнікі Гран-пры IX Адкрытага рэспубліканскага конкурсу выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах імя І. Дабравольскага ў рамках VII Адкрытага рэспубліканскага конкурсу музычнага мастацтва Беларусі "Спадчына" (Заслаўе, 2023), лаўрэаты першай ступені XII Міжнароднага конкурсу "Сібірыяда", прысвечанага 150-годдзю С. В. Рахманінава (удзельнічалі анлайн, падзея ладзілася Міністэрствам культуры РФ, Кемераўскім дзяржаўным інстытутам культуры ў 2023 годзе).

На сёння "Віціны" — адзін з самых дасведчаных калектываў Мінскай вобласці, усе імкнуцца браць прыклад з нас. Гэта не толькі маё асабістае меркаванне. Так думаюць і іншыя вядомыя музыканты, дырыжоры, прафесары. Яны лічаць, што менавіта Стоўбцы — сталіца духавой музыкі.

— А якія задачы і мэты ставіце перад калектывам на будучыню?

— Самыя высокія. Плануем шмат канцэртаў. Будзем працягваць камунікаваць і супрацоўнічаць з іншымі аркестрамі: ваеннымі, навучальнымі, прафесійнымі — і не толькі Міншчыны, але і ўсёй краіны. Таксама мусім падтрымліваць напрацоўкі і сувязі, якія назапасілі за гады працы. Мы прадоўжым дыялог з замежнымі калегамі, бо музыка — душа чалавека, што не мае меж і ўзросту.

Дзмітрый ЯНУШКЕВІЧ
Фота аўтара і з архіва калектыву

Аляксандр Нічыпаровіч за працай

Рэпетыцыя аркестра

Нумар "Беларускае вяселле", 2022

З любоўю да роднага

Сёння ў Канцэртнай зале "Мінск" знакамітыя "Харошкі" адсвяткуюць паўвекавы юбілей разам з гледачамі. Дата ўрачыстасці абраная не выпадкова: менавіта 26 студзеня 1974 года ў Белдзяржфілармоніі пачалася праца над стварэннем калектыву народнага танца, які будзе праслаўляць традыцыі роднай зямлі. Напярэдадні знакавай падзеі мы наведалі рэпетыцыю Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля "Харошкі" і даведаліся, якія сюрпрызы падрыхтавалі артысты для сваіх прыхільнікаў.

БЯСКОНЦА ЎДЗЯЧНЫЯ

Ужо 50 гадоў мастацкім кіраўніком і пастаноўшчыкам усіх праграм ансамбля з'яўляецца Валянціна Гаявая — лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне", кавалер Ордэна Францыска Скарыны, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. За гады працы яна стварыла мноства ўнікальных народных танцаў і на аснове фальклорнага матэрыялу рэалізавала больш за 80 арыгінальных пастановак.

— Жадаю свайму роднаму калектыву далейшага росквіту. "Харошкі" — гэта знакаміты брэнд, здольны праслаўляць Беларусь на ўвесь свет. Я бясконца ўдзячная нашым артыстам і публіцы за тое, што ніколі не бачыла пустых залаў і заўсёды чула авацыі! Няхай так будзе заўжды! — павіншавала сваіх калег і прыхільнікаў народная артыстка Беларусі Валянціна Гаявая.

ВЯЛІКАЯ ГАМА ПАЧУЦЦЯЎ

Летась у лістападзе мастацкім кіраўніком калектыву стала Ірына Анатольеўна Грушова, якая 24 гады аддана служыць "Харошкам" у якасці артысткі. Прыадкрыўшы заслону святочнага выступлення, яна распавяла, што ўбачыць глядач:

— Мы прадставім два аддзяленні — зімовае і вясновае, заснаваныя на эпічнай праграме "Беларусы", пабудаванай на гадавым коле абрадаў. Парадуем прыхільнікаў такімі нумарамі, як "Калыханка", "Завеі", "Дзед і баба", "Юр'я", "Гуканне вясны", "Заліпуха". Мы прымусім гледача і пасмяяцца, і задумацца, і расплакацца. Зачэпім нават тыя струны душы, якія ўжо даўно не трымцяць. Пакажам шмат розных прыгожых пастановак, аб'яднаных адной нашай стылістычнай музычнай і харэаграфічнай рысай, таму ўсё гэта будзе ўспрымацца як спектакль.

На пытанне пра новую пасаду Ірына Анатольеўна адказвае:

— Мая мэта — захаваць тое, што за 50 гадоў стварыла, назапасіла, зберагла Валянціна Іванаўна. Гэта трэба перадаць наступнаму пакаленню і імкнуцца развіваца далей. На мне ляжыць адказнасць не толькі за сябе як за артыста, але і за калектыў.

АПЛАДЗІРУЕ ЎВЕСЬ СВЕТ

"Харошкі" наведалі з гастролямі чатыры кантыненты, аб'ехалі ўвесь Савецкі Саюз, выступалі на найлепшых сцэнах свету. Дэманстравалі сваё майстэрства ў Лондане ў 1979-м падчас выставы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР, удзельнічалі ў адкрыцці зімовых Алімпійскіх гульняў у Солт-Лэйк-Сіці ў 2002-м. Летась прадставілі праграму ў рамках святкавання Дня рускай мовы ў штаб-кватэры UNESCO ў Парыжы. Нягледзячы на сусветную папулярнасць, артысты заўсёды з задавальненнем выступаюць і ў вёсках нашай краіны. У 1996-м "Харошкі" былі ўзнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь, а праз тры гады атрымалі званне заслужанага калектыву.

ЗАЛАТЫ СКЛАД

Амаль паўстагоддзя ансамблю служыць Святлана Кашталапава-Патаповіч — прыгажуня, на якую прыязджалі паглядзець з усіх куткоў планеты. Так гаварылі аб цяперашнім рэпетытары па балеце "Харошак". Менавіта яна ўваходзіла ў залаты склад, які стаяў ля вытокаў стварэння ансамбля. Восем пар танцораў і Фёдар Балабайка — душа калектыву. Фёдар Якаўлевіч сёння займае пасаду памочніка балетмайстра і працягвае радаваць гледача сваім танцам. Святлана Аляксандраўна была балерынай і марыла працаваць у Вялікім тэатры. Яе нават клікаў да сябе знакаміты Ігар Майсееў. Але любоў да свайго, роднага заўсёды на першым месцы:

— Для мяне ўсё жыццё "Харошках" пераліваецца яркімі фарбамі. Памятаю, як мы здавалі першую праграму. Напружана працавалі год. У 1977-м удзельнічалі ва Усесаюзным аглядзе-конкурсе сярод прафесійных калектываў Савецкага Саюза ў Маскве і сталі лаўрэатамі першай прэміі. Гэта была сенсацыя, бо нікому не вядомы беларускі калектыў выступаў нароўні з такім гучным імем, як ансамбль грузінскага Нацыянальнага балета імя Іліко Сухішвілі і Ніно Рамішвілі. Мы сталі адкрыццём! Для мяне самая цёплая і родная сцэна — Белдзяржфілармоніі. Самая значная — канцэртная зала імя П.І. Чайкоўскага. Гэта цяжкая пляцоўка, дзе далёка размешчаны кулісы, але ў той жа час яна самая паважаная. Свайму любімаму ансамблю хачу пажадаць пастаяннага росту! Я паважаю кожнага артыста, які тут працуе і нясе радасць гледачу. Пабольш яркіх выступленняў і запамінальных гастроляў! — зычыць заслужаная артыстка Беларусі Святлана Кашталапава-Патаповіч.

ВЫРАСЦІЦЬ ЗАМЕНУ

Калектыў "Харошак" аб'ядноўвае танцавальную і вакальна-інструментальную групы. У арсенале аркестра — класічныя і сучасныя музычныя інструменты: кларнет, флейта, скрыпка, альт, баян, гармонік, бас-гітара, ударная ўстаноўка. Непаўторны нацыянальны каларыт гучанню надаюць ліра, гудок, акарына, жалейкі, кмены. Кампазітар Уладзімір Гінько, аранжыроўшчык і аўтар песень, пастаянна папаўняе рэпертуар новымі творамі. З Валянцінай Гаявой у іх атрымаўся плённы творчы саюз. Разам працавалі над усімі без выключэння праграмамі калектыву.

Вырасціць новых артыстаў на ўласных традыцыях — такая мэта стаіць перад дзіцячай студыяй ансамбля "Харошкі". Цяпер там займаюцца 120 хлопчыкаў і дзяўчынак. І ўжо адзінаццаты год ёй кіруе артыстка "Харошак" Алена Багданава:

— Спадзяюся, за час сваёй працы не падвяла Валянціну Іванаўну. Вельмі перажывала, але дзякуючы яе падтрымцы ўсё склалася. Сёння як ніколі важна прывіваць любоў да нацыянальнай культуры. Дзеткі прыходзяць з шасці гадоў і займаюцца да дзявятага класа. Затым паступаюць у каледж і з дыпломам вяртаюцца да нас. Імкнёмся з маленства прывіць любоў да нашага калектыву і нацыянальнага каларыту. Вучні абавязкова наведваюць урокі класічных і народна-сцэнічных танцаў і растуць на багатым рэпертуары "Харошак". У нас ёсць некалькі нумароў, дзе дзеці працуюць з намі на сцэне. Для пачаткоўцаў гэта выдатная магчымасць пераняць найлепшае ад сваіх педагогаў, бо ўсе яны артысты ансамбля.

ЗАХАВАЦЬ СЛАВУТЫ СТЫЛЬ

У бліжэйшых планах "Харошак" распрацоўка гастрольнай дзейнасці як па рэспубліцы, так і за мяжой. Пры падтрымцы Міністэрства культуры запланаваны Дні Беларусі ў розных краінах.

— Мы калектыў з вялікай гісторыяй. Маем залаты фонд нумароў. Але гледача неабходна пастаянна чымсьці здзіўляць. Не менш важна захоўваць самабытнасць, спадчыну Валянціны Гаявой і Мікалая Дудчанкі — заснавальнікаў калектыву. "Харошкі" можна параўнаць з грацыёзнай дзяўчынай. Рамантычная лірыка і спакой — тое, што ўмеем паказваць толькі мы, — падкрэслівае дырэктар калектыву Руслан Вахедавіч Абдул. — У планах — папаўненне ансамбля новымі кадрамі, стварэнне нумароў і захаванне вядомага стылю, які выпрацоўваўся на працягу 50 гадоў.

Сёння "Харошкі" — айчынны брэнд і візітоўка краіны, дзякуючы якой наш таленавіты і працавіты народ ведаюць ва ўсім свеце! Пажадаем праслаўленаму калектыву здзяйснення мар і доўгага творчага жыцця!

Настасся ЮРКЕВІЧ
Фото з архіва ансамбля і Уладзіміра ШЛАПАКА

Валянціна Гаявая, 2019

Сцэны са спектакля "Забалоцце"

Патрыётыка і крэатыў — рэчы сумесныя

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі — творчая пляцоўка, дзе ідэі фантануюць бесперапынна, а таму падзеі і новыя праекты папросту віруюць. Да прыкладу, 19 студзеня сумесна з Цэнтрам беларускай драматургіі адбылася прэм'ера спектакля "Вечар", а дагэтуль усіх узрушыла "Забалоцце" і, крыху раней, тэатралізаванае чытанне п'есы "Я, бабуся, Іліко і Ларывон". Прычым усе тры — патрыятычнай тэматыкі.

"Вечар" Аляксея Дударава — гэта наша нацыянальная класіка, што ўвайшла ў школьныя падручнікі. П'еса пра трох старых у закінутай вёсцы ўпершыню была пастаўлена акурат 40 гадоў таму ў колішнім Ленінградзе і абышла ледзь не ўсе беларускія тэатры і многія замежныя. У РТБД яна зайграла новымі сэнсавымі фарбамі, атрымала новае жанравае азначэнне — "размовы ля калодзежа".

"Забалоцце" — фінальная, трэцяя частка трылогіі, створанай паводле беларускага песеннага фальклору. У аснове спектакля — рэальная гісторыя васьмі братоў, што загінулі ў Вялікую Айчынную. Ды і дзеянне "...Іліко..." разгортваецца ў 1941-м.

П'еса Гіга Лордкіпанідзэ паводле вядомага аднайменнага рамана Надара Думбадзэ атрымала папраўдзе бліскучае тэатралізаванае чытанне, рэалізаванае ў рамках праекта "Сучасная класіка" і надзвычай блізкае паўнавартаснаму спектаклю. Беларускі пераклад, зроблены ў свой час знакамітым драматургам Андрэем Макаёнкам, гучаў з сакавітым грузінскім акцэнтам. Добры, незласлівы гумар літаратурнага арыгінала не толькі не згубіўся, але і быў падкрэслены ўласна тэатральнымі сродкамі, пачынаючы з каларытнай лезгінкі сабакі Мурады. Пры такой сонечнасці ўвасаблення мірнага жыцця яшчэ больш балюча ўспрымалася вестка пра смерць сына Іліко, вырашаная праз кранальныя тэатральныя метафары (рэжысёр — Алена Зміцер). Сцэнаграфія і сцэнічныя строі Марыны Алекна спалучалі грузінскі каларыт з агульначалавечай сімволікай. Развешаная на вяроўцы бялізна падзяляла не проста сцэнічную прастору, а само жыццё — на даваеннае і пасля пачатку Вялікай Айчыннай. Невыпадкова гэты сумесны праект РТБД з Цэнтрам беларускай драматургіі атрымаў цалкам прадказальны працяг: наступны паказ адбудзецца 2 сакавіка ў рамках Тыдня беларускай драматургіі "Канцэнтрацыя".

"Вечар"

Тэатралізаванае чытанне п'есы "Я, бабуся, Іліко і Ларывон"

"Забалоцце" — гэта назва не толькі трэцяга спектакля ў жанры "песня ў адной дзеі", прысвечанага тэме смерці ў беларускім фальклоры, але і назва рэальнай вёскі. Само ж гэтае слова — спрадвечна беларускае, звязанае з нацыянальнай міфалогіяй — быццам адлюстроўвае яшчэ і тагасветны пачатак, што ляжыць за жыццёвай дрыгвой, калі тая паглыне чалавека цалкам.

Першы спектакль трылогіі, "Шлюб з ветрам", быў чорна-белым з рэдкім украплваннем чырвонага. Другі — "Пачупкі" з адмысловым зборам беларускіх калыханак — амаль цалкам чорным па колеравым выражэнні. "Забалоцце" ж — пераважна белае па сцэнаграфіі, з дадаткам розных адценняў шэрага як крыху забруджанай фарбы зімовага холаду, смяротнага адубення. У гэтай частцы магутнай тэатральнай сімфоніі збіраюцца разам і непарыўна сплятаюцца ўсе заяўленыя раней візуальныя лейтматывы: чорных крумкачоў, сабак, фізічнага і душэўнага гвалту, дзвярэй між сусветамі быцця і небыцця. Ды і сама нябачная (а часам і бачная) прысутнасць смерці лунала над героямі ранейшых частак трылогіі, сцвярджаючы непарыўную повязь жыцця і смерці як двух берагоў аднаго філасофскага рэчышча, немагчымасць іх існавання паасобку.

Пастаноўчая каманда ў складзе рэжысёра Яўгена Карняга, мастака Таццяны Нерсісян, кампазітара і музычнага кіраўніка Каці Аверкавай зрабіла папраўдзе сінтэтычнае, "складана падпаракаванае" тэатральнае дзеянне. Яркімі жанравымі эпізодамі, надзеленымі глыбокім духоўным сэнсам, становяцца моманты адкрытага звароту да эстэтыкі і прыёмаў тэатра ялек: узрастанне з зямлі свечак, інфернальнае і адначасова шчымлівае з'яўленне постаці бацькі, створанай з рыдлёвак, аблічча каровы, складзенае з галавы і мыліц, сцэна пакладання ў труну, дзе герой супраціўляецца, не хоча ў магілу, але дзверы за ім з грукатам зачыняюцца і зваротнага шляху няма.

Пры ўсім сваім трагічным напале спектакль пра смерць, што пачынаецца з абраду Дзядоў і памінання васьмі загінулых братоў, не пакідае змрочнага вэлюму. Бо становіцца гімнам жыццю: "А на гэтым свеце — усё наша багацце". Гэтыя залатыя словы беларускай народнай песні павінны стаць жыццёвым крэда кожнага з нас.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота з архіва тэатра

Марафон мастацкіх юбілеяў

Новы год мусіць прынесці яркія творчыя падзеі. Мастакі, якія працуюць у розных кірунках, рыхтуюцца да арыгінальных праектаў, а прадстаўнікі экспазіцыйных пляцовак прадумваюць канцэпцыі, што зацікавяць нават самага патрабавальнага гледача. Вядучыя ўстановы культуры падзяліліся планамі на чарговы сезон.

ХТО СПАДЧЫННІК МАЛЕВІЧА?

Беларускі саюз мастакоў сёлета робіць акцэнт на буйных праектах. Аб гэтым заяўлена 16 студзеня ў Мінску падчас прэс-канферэнцыі на тэму "Выставачны сезон 2024. Новыя творчыя праекты беларускіх мастакоў". Калектыўныя экспазіцыі мусяць паказаць усю шматгранасць сучаснай айчыннай культуры. Паўдзельнічаць запрашаюць не толькі чальцоў БСМ, але і студэнтаў ды прафесіяналаў, якія пакуль не ўступілі ў суполку.

Аб'яднанне адкрывае сезон праектам "1,10 квадрата", прысвечаным 110-годдзю "Чорнага квадрата" Казіміра Малевіча. Тэмай стане трансфармацыя гэтага вобраза ў сучасным мастацтве, а таксама пошук новых эстэтычных рашэнняў на стыку фармальных і сэнсавых пераўтварэнняў. Натуральна, прычыняцца да падзеі віцебскія аўтары. Яны будуць валадарыць на пляцоўках Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі — даўняга партнёра Саюза мастакоў. Залы сталічнага Палаца мастацтва збяруць працы адмысловуцаў з усёй краіны, якія прадстаўляюць розныя напрамкі і тэхнікі.

Прасачыць за гісторыяй развіцця графікі дазволіць традыцыйны праект Terragraphica. Сёлета яго прысвеляць міфалагічнай і біблейскай тэматыцы, да якой часта звяртаюцца майстры выяўленчага мастацтва. Публіка ўбачыць работы Сальвадора Далі, Марка Шагала і іншых знакамітых мастакоў з прыватных калекцый. Побач будуць дэманстравацца творы айчынных аўтараў — як вядомых, так і пачаткоўцаў.

Асобны праект Саюз мастакоў прымяркуе да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Калі звычайна на падобных выставах паказваюць фондавыя працы адмыслоўцаў, што прайшлі вайну, то гэтым разам прадставяць сучасныя, у цэнтры якіх — вобраз жанчыны і маці.

Яркай панарамай беларускага мастацтва будуць Трыенале жывапісу, графікі і скульптуры, трыенале "Канцэпт". Яны дадуць магчымасць пазнаёміцца з выказваннямі на любы густ. Формы — ад традыцыйных да новых авангардных. Чакаюць публіку і іншыя праекты.

Акрамя таго, працягнецца супрацоўніцтва Беларускага саюза мастакоў з абласнымі музеямі. Зазвычай у рэгіянальных установах аб'яднанне паказвае найбольш яркія рэспубліканскія праекты. Летась жыхары буйных гарадоў знаёміліся з класічнымі работамі з фондаў БСМ, сёлета будуць прэзентаваны больш авангардныя творы.

УСМЕШКА ДЗЕЛЯ СЯБРОЎСТВА

Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў нацэлены на развіццё міжнародных сувязей. Першым праектам у гэтым рэчышчы сёлета будзе экспазіцыя "Сто ўсмешак Гагарына. Усмешка для міру". Буйная выстава прымеркавана да 90-годдзя з дня нараджэння першага ў свеце касманаўта. Да ўдзелу запрашаюцца аўтары-прафесіяналы, студэнты і навучэнцы школ мастацтваў, якія шчыруюць на ніве жывапісу, графікі, скульптуры, медыяарту. Галоўная ўмова — работа мусіць змяшчаць партрэт Юрыя Гагарына ці яго ўсмешку. Выбар тэматыкі даволі сімвалічны. У ім закладзены заклік да сяброўства і стваральнай працы. Менавіта шчырая і добрая ўсмешка героя скарыла сэрцы людзей па ўсім свеце. Сёння варта імкнуцца да такой жа еднасці, што панавала пасля першага палёту чалавека ў космас. Адметна, што суарганізатарам экспазіцыі выступае Аб'яднаны мемарыяльны музей-запаведнік Ю. А. Гагарына. З гэтай установай НЦСМ ужо зладзіў шэраг агульных праектаў.

Абвешчаны open call, які папярэднічае яшчэ адной міжнароднай ініцыятыве. Аўтарам і творчым калектывам з нашай краіны і замежжа прапануюць далучыцца да фестывалю "Тэкстыльны букет", што сёлета адбудзецца шосты раз. Лапікавае шыццё, ткацтва, аплікацыя, вязанне... Работы могуць быць выкананы як у традыцыйных, так і ў эксперыментальных тэхніках з самых розных матэрыялаў. А магчымасць паўдзельнічаць маюць не толькі прафесійныя мастакі, але і самадзейныя майстры, выхаванцы дзіцячых арт-студый і школ.

Увогуле ж падтрымка маладых творцаў і куратараў — адзін з прыярытэтаў НЦСМ. Прыкладам, да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў установа зладзіць адмысловы пленэр, па выніках якога плануецца справаздачная выстава. Верагодна, такая падзея адкрые публіцы новых асоб, што неўзабаве заваююць шырокае прызнанне.

ПЕРЛІНЫ КАЛЕКЦЫІ

Для Нацыянальнага мастацкага музея 2024-ы пройдзе пад знакам юбілею. Сёлета гэтай скарбніцы спаўняецца 85 гадоў. Адметнай дацэ прысвечана выстава афіш і архіўных фатаграфій, што нагадвае пра найбольш значныя за ўсю гісторыю ўстановы праекты. А ў лістападзе, у дзень адкрыцця галоўнага музейнага будынка, прэзентуюць экспазіцыю "Калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Страты ў гады Вялікай Айчыннай вайны і вяртанні".

Фонды скарбніцы налічваюць больш за 30 тысяч прадметаў. І сёлета музей будзе актыўна знаёміць аматараў мастацтва са сваімі калекцыямі. Дзве выставы прысвецяць сакральным творам — "Беларуская алтарная скульптура і разьба XVII—XVIII стагоддзяў" ды "Сімвалы і алегорыі ў мастацтве Беларусі XVII—XIX стагоддзяў". Адмыслова для гэтых праектаў прадметы праходзяць кансервацыю і рэстаўрацыю.

Шэраг часовых экспазіцый прымяркуюць да юбілеяў славутых аўтараў. Прыкладам, запланавана выстава, прысвечаная Віцебскай мастацкай школе на чале з Юдалем Пэнам і Мінскай мастацкай школе пад кіраўніцтвам Янкеля Кругера. Таксама персанальных праектаў удастоюцца Ілья Рэпін, Леў Альпяровіч, Уладзімір і Раіса Кудрэвічы, Павел Масленікаў, Васіль Шаранговіч, Андрэй Заспіцкі. Іншых аўтараў, чые юбілеі краіна адзначае сёлета, ушануюць на традыцыйнай выставе "Плынь часу".

80-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў будзе прысвечана сумесная са Студыяй ваенных мастакоў Цэнтральнага дома афіцэраў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь экспазіцыя. Таксама чакаюцца выставы віцебскага творцы Леаніда Мядзвецкага, дынастыі Шыбнёвых "Браслаўскі край і Налібоцкая пушча — жамчужыны Беларусі", прэзентацыя сучаснага мастацтва Мардовіі і экспазіцыя, арганізатарам якой выступіць Пасольства Азербайджанскай Рэспублікі.

Данііл ШЭЙКА
Фота з архіва Нацыянальнага мастацкага музея

Падчас выступлення

Музыка, якая заўсёды ў трэндзе

“Верас” здолеў атрымаць званне народнага ўсяго праз чатыры гады пасля з'яўлення на сцэне. Сёння ён ужо 10 гадоў носіць пачэсны тытул “заслужаны”. Кіруе ансамблем малады музыкант, які адчувае асаблівую павагу да гучання народных інструментаў. Пра тое, як заставацца ў трэндзе, Яўген Глушань расказаў “Культуры”.

— Яўген, калектыў існуе болей за трыццаць гадоў. З чаго пачынаўся яго шлях?

— Ансамбль народных інструментаў “Верас” заснаваны ў 1994 годзе пры “Дзіцячай школе мастацтваў №5 г. Гомеля”. Многія пытаюцца, з чым звязана назва нашага калектыву. Насамрэч усё проста. Калі першыя кіраўнікі думалі над тым, кім нам быць, — на двары стаяў верасень. Вось і вырашылі скараціць назву месяца. Так і атрымаўся “Верас”. Проста, меладычна і лірычна.

“Верас” заснавалі Вячаслаў Леўчанка і Ларыса Лукашэнка. Дарэчы, Вячаслаў Іванавіч дагэтуль іграе ў ансамблі на кларнеце. Крыху пазней калектыў узначаліў Анатоль Трафімовіч. І вось зусім нядаўна яго кіраўніком стаў я.

Мэтамі і задачамі ансамбля з'яўляюцца павышэнне выканальніцкага ўзроўню настаўнікаў школы, іх запатрабаванасці да творчай самарэалізацыі, папулярызацыя народных інструментаў, прапаганда сярод насельніцтва найлепшых узораў класічнай, народнай і папулярнай музыкі айчынных і замежных аўтараў, актыўны ўдзел у гарадскіх, раённых, абласных канцэртных мерапрыемствах, служэнне гледачу. Першыя гады былі перыядам творчага развіцця і пошуку. У 1997-м ансамбль стаў лаўрэатам I Абласнога конкурсу аркестраў, ансамбляў струнных народных інструментаў “Мелодыі роднага краю” імя Г. Жыхарава. У немалой ступені поспеху садзейнічаў прыход у калектыў маладых, таленавітых педагогаў-выканаўцаў. Цяпер “Верас” пашырае сваю канцэртную біяграфію, актыўна ўдзельнічае ў мерапрыемствах школьнага, раённага, гарадскога, абласнога, рэспубліканскага ўзроўню.

— Хто вашы музыканты?

— Сярод членаў калектыву людзі рознага ўзросту. Ёсць і дваццацігадовыя хлопцы і дзяўчаты, і тыя, каму за шэсцьдзесят. Усе жывуць адной ідэяй, імкнуцца яе рэалізаваць. Мы камунікуем не толькі словамі, стасуемся на ўзроўні музыкі, духоўнай плыні. Калектыў — гэта сям'я: адзін за ўсіх і ўсё за аднаго! Насамрэч мы ганарымся кожным нашым артыстам. Толькі ўявіце, якая разнастайнасць інструментаў: малыя домры, альтавыя домры, баяны, акардэон, цымбалы, балалайка альт і балалайка секунда, гуслі клавішныя, флейта, кларнет, бас-гітара, шумавыя перкусійныя інструменты і ўдарная ўстаноўка. І за гучанням кожнага з іх стаіць праца і талент прафесіяналаў.

Яўген Глушань:

— Перспектыву ўдзельнікі нашага калектыву бачаць у распаўсюджванні высокіх узораў народнай музыкі, у служэнні нацыянальнай культуры, беларускаму народу.

— Яўген, у любы час існуе пэўны запыт аўдыторыі на нейкі канкрэтны стыль або кірунак. Як вы лічыце, ці трэба гнацца за модай, каб заставацца папулярным у гледача?

— Хочаш ты гэтага ці не, за трэндам давядзецца ісці. Сама плынь жыцця ўсё роўна будзе цябе накіроўваць. Мы жывём у стагоддзі, дзе тэхналогіі і трэнды мяняюцца ледзь не кожны дзень. Угнацца за ўсімі не атрымаецца. Нам не абавязкова выконваць нешта новае, можна выбраць даўно вядомае, але апрацаваць яго на сучасны лад.

— Як часта выступаеце і якімі канцэртамі ганарыцеся?

— Кожны канцэрт “Вераса” — асаблівы. Сярод найбольш значных выступленняў можна назваць праграмы “Жураўлі на Палессе ляцяць”, прысвечаную 860-годдзю з дня заснавання Гомеля, “Музыка — сутнасць свету” ў рамках III Міжнароднай канферэнцыі “Праз парадненне гарадоў да ўстойлівага развіцця”, да святкавання Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Наш ансамбль ведаюць і любяць жыхары вёсак. Калектыў неаднаразова выступаў у Буда-Кашалёўскім, Добрушскім, Веткаўскім, Кармянскім раёнах Гомельшчыны. Дабрачынныя канцэрты прайшлі ў шпіталі для ветэранаў вайны, школе-інтэрнаце, сацыяльна-педагагічным цэнтры і доме састарэлых у вёсцы Дуянаўка Гомельскага раёна. Усім людзям, якія прыходзяць на нас паглядзець, мы аддаём часцінку сваёй душы. У адказ атрымліваем у тысячу разоў больш цеплыні.

Прафесіяналізм калектыву падкрэслівае арыгінальны падбор рэпертуару, непаўторны стыль і віртуознасць выканання, уменне дакладна перадаць задуму кампазітара. “Верасу” па сілах выканаць такія творы, як “Палёт чмяля”, “Руская тройка” і “Рускі вальс”. Серыю тэматычных канцэртаў ансамбль прысвяціў творчасці беларускіх кампазітараў — Юрыя Семянякі, Генадзя Ермачэнкава, Ігара Лучанка.

— А ці былі ў вашай практыцы непрадбачаныя сітуацыю, з якіх вашы віртуозы знайшлі выйсце?

— Так. Некалькі гадоў таму мы выступалі ў цэнтры горада на плошчы Леніна. Канцэрт абяцаў быць звычайным. Праграму ведалі, былі гатовыя. Аднак атрымалася так, што электрыкі не прадугледзелі магчымасць падключэння басгітары, і нашаму музыканту, які павінен быў граць на ёй, прыйшлося брацца за народны кантрабас. Гэта такая вялікая трохкутная балалайка. Але прафесіянал справіўся. Таленавіты чалавек сапраўды таленавіты ва ўсім.

— А чаму ўсё ж вы выбралі справай жыцця менавіта народнае гучанне?

— Музыка можа праходзіць праз чалавека. І мы імкнёмся, каб яна пакінула ў душы цудоўны след. Яго мы мусім распаліць у сэрцах сваіх выхаванцаў. Мне вельмі хацелася б, каб гэта цёплае, светлае, сапраўднае і радаснае ім удалося захаваць на ўсё жыццё, перадаць сваім блізкім, сваім дзецям.

Музыка спрадвеку мела ўласцівасць сагрэць нават самае сцюдзёнае сэрца. Мы хочам данесці гэтую думку да нашых артыстаў і гледачоў. Сёння складана прыцягнуць моладзь да народных інструментаў, але гэта наша гісторыя, нашы традыцыі, тое, што мы абавязаны захаваць. У гэтым і ёсць наша Беларусь!

Перспектыву ўдзельнікі нашага калектыву бачаць у распаўсюджванні высокіх узораў класічнай і народнай музыкі, у служэнні нацыянальнай культуры і мастацтву, беларускаму народу.

Ганна САКАЛОВА
Фота з архіва калектыву

Лідскі — ад слова “лідар”

◄ Алена Серакова

Лідскі дзяржаўны музычны каледж справіў 50-годдзе. У параўнанні са сталічным, якому сёлета споўніцца сто, — усяго толькі “ўнучак”. Але ж які таленавіты ды апантаны! Пра дасягненні, адметныя рысы і будучыню ўстановы распавядае яе дырэктар Алена Серакова.

— Падобных навучальных устаноў, дзе можна атрымаць сярэднюю музычную адукацыю, у Беларусі больш за дзесяць. У чым адметнасць, а мо і ўнікальнасць Лідскага каледжа? На юбілей была вызначана формула вашага поспеху, маўляў, “сума маладосці, прыгажосці і таленту, памножаная на вопыт, традыцыі, упартую працу і пошук новага”. Але ж яна ўніверсальная і падыходзіць усім.

— Асаблівых рыс шмат. Найперш я б адзначыла сацыяльную скіраванасць. Сапраўды, ёсць сталічныя ўстановы. Літаральна побач, усяго ў сотні кіламетраў ад нас, — Гродна з яго куды больш развітай інфраструктурай у галіне культуры: там і тэатры, і філармонія. Нядзіва, што многія едуць туды. А ў нас навучаюцца далёка не толькі лідчане: шмат падлеткаў з райцэнтраў, сельскай мясцовасці, аграгарадкоў. У параўнанні з іншымі музычнымі каледжамі, у нас шмат абітурыентаў-сірот, з няпоўных сямей, сямей у сацыяльна небяспечным становішчы. І за чатыры гады навучання яны назапашваюць той гуманітарны багаж, тыя веды ў галіне культуры і мастацтва, што іншыя набываюць куды больш павольна, за ўсё сваё ранейшае жыццё. Назіраць, як яны робяць такі неверагодны скачок, дзень за днём, урок за ўрокам — сапраўднае задавальненне. І ў выніку вырастаюць у знаных дзеячаў музычнага мастацтва краіны і замежжа. Ці проста ў адукаваных, інтэлігентных, духоўна багатых людзей, узровень культуры якіх будзе дапамагаць ім у любой абранай сферы.

— Невыпадкова да юбілею вы выпусцілі буклет “Асобы, народжаныя ў творчасці”, дзе згадалі і зорных выпускнікоў, і выкладчыкаў, і вашы папраўдзе зорныя калектывы, што атрымалі прызнанне ў многіх краінах свету.

— У нас склаўся ўнікальны выкладчыцкі калектыў — інтэрнацыянальны, у якім з'ядналіся выпускнікі розных кансерваторый: не толькі Беларускай, але і Бакінскай, Адэскай, Маскоўскай, Ленінградскай, Астраханскай, Петразаводскай, Данецкага і Растоўскага музычна-педагагічных інстытутаў і многіх іншых. Яшчэ адна адметнасць — у нас як нідзе развіты патрыятызм. Я з'яўляюся дэпутатам Гродзенскага абласнога савета дэпутатаў па 41-й Маладзёжнай выбарчай акрузе і сваёй найпершай задачай лічу кампетэнтнае правядзенне ў каледжы маладзёжнай дзяржаўнай палітыкі. Мы арганізуем масу мерапрыемстваў патрыятычнага гучання, звязаных з тэмай Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа, супрацоўнічаем з пракуратурай, наогул з сілавымі структурамі.

— Вядома, сябруеце і з калегамі? Маю на ўвазе іншыя музычныя навучальныя ўстановы.

— Так-так, і не толькі з імі. Наш музычны каледж — адзіны ў краіне, які мае дамову аб супрацоўніцтве з Мінскай духоўнай семінарыяй, што ў Жыровічах. Гэты дакумент быў падпісаны шмат гадоў таму і працягвае дзейнічаць да цяперашняга часу. Ладзяцца сумесныя мерапрыемствы, семінары, канцэрты салістаў і калектываў, у рэпертуары якіх шмат духоўных твораў.

Народны аркестр беларускіх народных інструментаў "Бравэрка"

— У вашым каледжы вучацца будучыя прадстаўнікі розных музычных прафесій. Але спецыялізуецеся вы на народных інструментах. Абодва вашы народныя аркестры (і не толькі яны) — шматлікія ладаўрэаты міжнародных конкурсаў і фестываляў. Менавіта ў вас “прапісаўся” Рэспубліканскі адкрыты конкурс выканаўцаў на народных інструментах імя Іосіфа Жыновіча.

— Сёлета ў маі пройдзе ўжо дзясяты такі конкурс — па шасці намінацыях, адпаведна інструментам, і ў дзвюх узроставых групах. Мы сапраўды арыентуемся на народныя інструменты. Але не менш цудоўныя ў нас выканаўцы на духавых, моцныя харавікі, прычым як народнага, так і акадэмічнага кірункаў. І духавы аркестр, і камерны жаночы хор, і ансамбль “Вербіца” неаднойчы адзначаліся на творчых спаборніцтвах у нас і за мяжой. А колькі ўзнагарод сабраў камерны аркестр! Ды кожны калектыў — перліна.

— Яшчэ і таму, што ёсць дзе адточваць майстэрства: каледж вядзе шырокую канцэртную дзейнасць. Нават юбілейныя святкаванні і грандыёзны канцэрт праходзілі ў гарадскім Палацы культуры. Дарэчы, што ў бліжэйшых планах?

— Акрамя ўласна вучэбнай работы, рыхтуем канцэртныя праграмы да Дня Перамогі і 80-годдзя вызвалення Беларусі. Адна будзе складзена з музыкі да савецкіх і сучасных фільмаў пра вайну. Другая збярэ песенныя хіты пра Вялікую Айчынную. Абедзве будуць суправаджацца выбітным відэашэрагам — з сямейных архіваў выкладчыкаў і навучэнцаў. Бо паміж песнямі прагучаць сямейныя гісторыі пра сваякоў, што змагаліся на фронце і ў тылу: вайна закранула кожнага. Гэтыя праграмы наш духавы аркестр плануе цягам года выканаць у райцэнтрах Гродзенскай вобласці, на адкрытых пляцоўках у Лідзе, Міры, Навагрудку, Воранава, Іўі, а таксама непасрэдна для вайскоўцаў па ўзгадненні з камандаваннем той ці іншай часткі, для саюза ветэранаў Ліды, ветэранаў ракетнай дывізіі, школьнікаў. Гістарычная памяць — той падмурак, што трымае нас у сучаснасці. І захаванне яе праз музыку адкрывае новыя магчымасці, бо музыка — гэта эмоцыі, адлюстраванне чалавечай душы.

— Словы музыказнаўцы! Менавіта па гэтай спецыяльнасці вы калісьці скончылі Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі, а нядаўна яшчэ і магістратуру юрыдычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Тэмай вашай магістарскай дысертацыі стала “Музычная культура як рэсурс гуманітарнай бяспекі краіны”.

— Я імкнулася давесці значнасць музычнай культуры, якая садзейнічае захаванню і ўстойлівому развіццю нацыі і дзяржавы, гарманізуе стасункі чалавека з соцыумам, цэласна ўздзейнічае на групавую свядомасць і сістэму каштоўнасцей, уплывае на палітычны, маральны, эканамічны складнікі краіны. І праз усё гэта здольная кансалідаваць грамадства, забяспечыць гуманітарную бяспеку, ніяк не менш важную за палітыку і эканоміку. Бо бяспека краіны — гэта захаванне не толькі яе тэрытарыяльнай незалежнасці, але і чалавечага патэнцыялу, культурнага капіталу. Без чалавека, яго душэўнага здароўя і развітога інтэлекту ўсё навокал папросту губляе сэнс. Ці ж гэта не так?..

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота з архіва каледжа

Мінулае, адбітае ў метале

Сёння мы звернемся да цікавай і важнай старонкі беларускай гісторыі і сучаснасці — медальерства, якому споўнілася паўтысячы гадоў. Значны юбілей стаў нагодай разабрацца: хто і як развіваў гэта мастацтва на нашых землях.

Прылады для вырабу медалёў

Жыгімонт I Стары (Ян Марыя Падавана, 1532)

Жыгімонт II Аўгуст (Даменіка Венетус, 1548)

Медаль (ад франц. medaille) — круглы ці авальны знак з выявамі на адным або двух баках, створаны ў гонар асобы ці падзеі.

З ЛІДЫІ ПРАЗ ГРЭЦЫЮ Ў РЫМ

Але спярша — невялічкі экскурс у гісторыю сусветнага медальернага мастацтва, часткай якога, безумоўна, ёсць беларускае.

Лічыцца, што манеты — а з імі і медальерства — з'явіліся на мяжы VIII—VII стагоддзяў да н. э. у Лідыі (даўнейшая краіна на поўдні Чорнага мора). Апошнім вядомым кіраўніком гэтай дзяржавы быў Кроз — той самы, чыя заможнасць нарадзіла выраз "багаты, як Кроз". Адтуль мастацтва перайшло ў Старажытную Грэцыю і ад яе як "спадчына" — у Старажытны Рым. Праўда, да XIV стагоддзя медальерства было прадстаўлена толькі грашовымі адзінкамі.

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ — НОВАЯ РОЛЯ

Заснавальнікам звычнага нам медальерства лічаць выдатнага італьянскага жывапісца эпохі Адраджэння Антоніа Пізана (Пізанела), які вырабіў памятны медаль з нагоды візіту ў Фларэнцыю візантыйскага імператара Іаана VIII Палеалога ў 1437—1438 гг. Сказаць, што з гэтага моманту Еўропа захварэла на медальернае мастацтва, — не сказаць нічога. І, пэўна, прыклаў руку да росту папулярнасці памятных медалёў паэт-гуманіст Петрарка (памёр у 1479-м), аўтар ідэі адраджэння медаля як твора мастацтва, а не грашовай адзінкі.

З Італіі, што дала свету нямала ўзораў высокага медальерства, яно распаўсюдзілася на поўнач, у Германію, Аўстрыю, Францыю, Швецыю, Англію ды іншыя краіны. Цікава, што ў эпохі Рэфармацыі і Контррэфармацыі, акрамя ўжо звычайных сюжэтаў — выяў той ці іншай асобы, значнай падзеі, — нарадзіліся яшчэ і сатырычныя медалі, медалі-перэваратні. У той час, калі нямецкія пратэстанты высмейвалі рымскіх папаў, адмысловцы папскага двара стваралі медалі ў гонар змрочных гістарычных эпізодаў, напрыклад Варфаламееўскай ночы ў 1572-м (тады каталікі забілі каля трох тысяч парыжскіх пратэстантаў). Так медальерства пачало выкарыстоўвацца як сродак ідэалагічнай барацьбы. У Расію гэтае мастацтва ў еўрапейскім выглядзе прыйшло даволі позна, толькі пры Пятру I. Запрошаныя з-за мяжы майстры заняліся ўвекавечваннем перамог цара-імператара ў Паўночнай вайне. У 1764-м пры Акадэміі мастацтваў у Санкт-Пецярбургу быў заснаваны асобны медальерны клас. Цікаўным можна параіць манаграфію "Медальерное искусство в России XVIII века" (1962).

НАРАДЖЭННЕ "БЕЛАРУСКАГА"

Гісторыя беларускага медальернага мастацтва дзеліцца на пэўныя перыяды, звязаныя з Вялікім Княствам Літоўскім, Рэччу Паспалітай Абодвух Народаў (ад 1569-га), Расійскай імперыяй, БССР і незалежнай Рэспублікай Беларусь.

За год, у якім пачаўся летапіс айчыннага медальерства, можна прыняць 1508-ы. Менавіта тады невядомы майстар на землях сённяшняй Польшчы выканаў памятны медаль (ён лічыцца і першым польскім медалём). Твор прысвяціці візіту караля Уладзіслава II Ягелончыка ў Нысу. Трэба адзначыць, што Уладзіслаў II (спярша чэшскі, а потым венгерскі кароль) быў сынам польскага караля і вялікага князя літоўскага Казіміра IV, унукам польскага караля і вялікага князя літоўскага Ягайлы і Сафіі Гальшанскай, праўнукам Альтерда, прапраўнукам Гедыміна і Еўны Полацкай. Не чужы нам чалавек.

Праўда, прыйшлося пачакаць некалькі гадоў, пакуль медальернае мастацтва на землях Польскага Каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага не пусціла карані.

ЗРУХІ АД БОНЫ СФОРЦЫ

Жонкай польскага караля і вялікага князя літоўскага Жыгімонта I Старога (яшчэ аднаго ўнука Ягайлы) у 1518 годзе становіцца знакамітая Бона Сфорца, дачка міланскага герцага. Дзякуючы ёй на беларускіх землях здарыліся тэкстанічныя зрухі ва ўсіх сферах жыцця. Перш-наперш — эканоміцы, а таксама ў кулінарыі, мастацтве, у тым ліку і медальерным. Была Бона Сфорца і вялікім знаўцам атрутных рэчываў.

У 1520 годзе ў гонар першынца, Жыгімонта II (у 1522-м ужо абраны вялікім князем літоўскім!), бацька загадвае адліць невялічкі срэбны медаль. Яго аўтарства прыпісваюць італьянскаму архітэктару і скульптару Джавані Ціні з Сіены, які перабраўся ў Польшчу і асеў у Кракаве. Далей пачаўся сапраўдны "медальны бум".

У 1526 годзе Крыштаф Шыдлавецкі, вялікі каронны канцлер, ваявода і кашталян кракаўскі (палымяны праціўнік Боны Сфорцы і сваяк Мікалая Радзівіла Чорнага, прыхільніка ідэі незалежнасці ВКЛ ад Польшчы), замаўляе слыннаму майстру Гансу Шварцу медаль са сваёй выявай. Пэўна, Шыдлавецкі нешта адчуваў, бо зусім хутка, у 1532-м, ён развітаўся з жыццём. У 1526—1527 гг. Ганс Шварц адлівае яшчэ серыю медалёў, гэтым разам прысвечаных Жыгімонту I Старому. Неўзабаве, у 1527 годзе, з невядомай прычыны мастак пакідае каралеўскі двор і адпраўляецца ў Парыж. Лічыцца, што за жыццё Шварц вырабіў каля 170 медалёў, якія вылучаліся дасканалай рэалістычнай характарыстыкай мадэлі.

Увогуле падчас панавання Жыгімонта II Аўгуста (ад 1548 года) і яго маці Боны Сфорцы (трымала стырно ўлады ў сваіх руках) адзін за адным з'яўляліся ўсё новыя і новыя медальеры, якія пакінулі па сабе багатую спадчыну. Вось хіба некалькі імёнаў. Вакантнае месца Шварца адразу заняў італянец Джавані Марыя Моска (больш вядомы як Ян Марыя Падавана, памёр пасля 1574-га). Гэта выдатны адмысловец, які ў 1532 годзе вырабіў серыю з чатырох медалёў. На творах выяўлена каралеўская сям'я — Жыгімонт I, Бона Сфорца і іх дзеці Жыгімонт Аўгуст, Ізабэла Ягелонка. Медалі з волава, бронзы і срэбра былі даволі вялікія (дыяметр — 70 міліметраў), двухбаковыя. Лічыцца, што менавіта Падавана заклаў трывалыя падмуркі далейшага развіцця дробнай пластыкі ў Польшчы (натуральна, і на землях ВКЛ).

Яшчэ варта згадаць Даменіка Венетуса, аўтара вядомага медаля з выявай каранаванага Жыгімонта Аўгуста (1548), Джавані Джакома Караджыа, стваральніка медалёў, прысвечаных каралеўскай сям'і (1532), Пастарына дэ Пастарыні, што ў 1556 годзе выбіў медаль з выявай Боны Сфорцы. Гэты аўтар, верагодна, быў адным з апошніх італьянскіх майстроў, якія пакінулі нашы землі разам з Бонай Сфорцай (памерла ў 1557-м).

Што адбывалася далей і як развівалася гісторыя айчыннага медальерства перыяду Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў (1569—1795 гг.), чытайце ў наступных выпусках "К".

Зміцер ЮРКЕВІЧ

Пункт адліку — Іаан VIII Палеалог (Пізанела, кан. 1430-х)

Бона Сфорца (маст. Жан Жак Каралье, 1546)

Звычайна на аверсе змешчаны партрэт, на рэверсе — фігурная, сюжэтная, алегарычная ці геральдычная кампазіцыя.

Традыцыйныя матэрыялы — срэбра, золата, волава, бронза.

*

Палажэнне

аб творчым конкурсе праектаў зборнікаў рэпертуарных нотных выданняў для аматарскіх калектываў мастацкай творчасці

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Творчы конкурс аўтараў і складальнікаў зборнікаў нотных выданняў праводзіцца Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур (далей — Цэнтр) з мэтай пашырэння рэпертуару непрафесійных (аматарскіх) калектываў мастацкай творчасці, развіцця беларускай песеннай і музычнай творчасці.

II. ЗМЕСТ І ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

2.1. Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца як аўтары музычных твораў, так і складальнікі зборнікаў песень, танцаў з нотным матэрыялам, якія прызначаюцца для аматарскіх калектываў мастацкай творчасці. У праектах нотных выданняў могуць выкарыстоўвацца творы іншых аўтараў пры ўмове выканання палажэнняў Закона Рэспублікі Беларусь "Аб аўтарскім праве і сумежных правах".

2.2. Матэрыялы на конкурс дасылаюцца да 19 лютага 2024 г. на адрас Цэнтра — 220029, г. Мінск, вул. Чычэрына, 19, Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур; на электронную пошту rcnk-1994@mail.ru. Даведкі па тэл. 8 017 3654695; 8 029 6056024 (Вайцяхоўская Раіса Іосіфаўна).

2.3. У заяўцы ўказваецца прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка(-аў) конкурсу, месца працы (вучобы), паштовы адрас, кантактны тэлефон, e-mail. Дадаюцца матэрыялы зборніка (не менш за 20 старонак).

2.4. Матэрыялы прымаюцца ў электроннай і друкаванай формах.

2.5. Патрабаванні да нотных матэрыялаў аўтараў музычных твораў.

У конкурсе прымаюць удзел нотныя матэрыялы, якія раней не публікаваліся. Творы павінны мець выгляд клавіра або партытуры, быць выразна і дакладна напісаны чорнай пастай на нотнай паперы ці набраны ў нотным рэдактары на камп'ютары і надрукаваны на прынтары ў двух экзэмплярах.

На тытульным лісце клавіра (партытуры) пазначаюцца поўная і дакладная назва твора (вялікімі літарамі), прозвішча і ініцыялы кампазітара ці аранжыроўшчыка (курсівам справа). Калі прадстаўляюцца вакальныя або харавыя творы, то, акрамя аўтара музыкі, указваецца і аўтар літаратурнага тэксту (курсівам злева).

Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца творы інструментальныя, вакальна-інструментальныя, вакальныя, якія можна выконваць a cappella ці з інструментальным суправаджэннем. Калі твор павінен выконвацца пад акампанемент, то суправаджэнне абавязкова прапісваецца кампазітарам у партытуры. У нотах аўтарам таксама павінен быць выстаўлены меркаваны тэмп (пажадана па-італьянску) ці канкрэтны метраном. Каля ўказання тэмпу можа быць дадзена эмацыйная характарыстыка выканання твора (пажадана па-італьянску). Акрамя таго, у партытуры ці клавіры ад пачатку да канца кампазітарам адлюстроўваюцца ўсе магчымыя рытмічныя, артыкуляцыйныя, дынамічныя і тэмпавыя асаблівасці опуса, вывераныя (калі яны ёсць) абазначэнні лічбоўкі ў адпаведнасці з гарманічным планам партытуры. Ступень складанасці твораў павінна адпавядаць сучасным магчымасцям аматарскіх калектываў мастацкай творчасці.

Нотныя матэрыялы, якія не адпавядаюць вышэйпералічаным патрабаванням, перададзены неразборліва ці з грубымі памылкамі і парушэннямі правіл запісу музыкі, разглядацца журы не будуць.

Нотныя матэрыялы, прадстаўленыя на конкурс, удзельнікам не вяртаюцца.

III. ЖУРЫ І ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ

3.1. У журы конкурсу, якое зацвярджае дырэктар Цэнтра, уваходзяць прадстаўнікі Саюза кампазітараў Беларусі, спецыялісты ўстаноў культуры.

3.2. Журы згодна з крытэрыямі якасці і мэтазгоднасці вызначае пераможцаў, работы якіх будуць надрукаваны ў агульным ці асобным зборніку на працягу года, аўтары выданняў атрымаюць ганарары згодна з заключанай дамовай. Выпушчаныя зборнікі будуць перададзены для выкарыстання беларускім аматарскім калектывам мастацкай творчасці ў Беларусі і ў краінах замежжа.

3.3. Вынікі конкурсу афармляюцца пратаколамі журы.

3.4. Склад журы конкурсу:

старшыня — Атрашкевіч Алена Вікторараўна, старшыня праўлення Саюза кампазітараў Беларусі, выкладчык Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў;

сакратар — Вайцяхоўская Раіса Іосіфаўна, намеснік начальніка аддзела народнай творчасці Цэнтра;

Захлеўны Леанід Канстанцінавіч, кампазітар, народны артыст Беларусі, мастацкі кіраўнік заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля народнай музыкі "Бяседа" Белтэлерадыёкампаніі;

Грамовіч Ірына Міхайлаўна, дэкан факультэта музычнага і харэаграфічнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

Слесарчык Дзмітрый Леанідавіч, намеснік начальніка ўпраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

УНП 100855055

УРАЖАННЕ

І багата музыкі...

Фестываль харавой музыкі "Святло Каляднай зоркі" шмат гадоў гасцінна расчыняе дзверы перад публікай. Феерычнае свята праходзіць на розных пляцоўках Мінска, удзельнічаюць у ім як дзіцячыя хоры, так і калектывы навучальных устаноў. І гучыць багата беларускай музыкі...

Сёлета адкрыў канцэрт новы твор маладога кампазітара Вячаслава Пяцько "Дзіўная навіна" — цыкл калядных псальмаў для хору і інструментальнага ансамбля. Захопленая і затоеная, урачыстая і лірычная музыка адлюстроўвае ўсе грані святочнага настрою. Некалькі народных калядак арганічна сплялісі ў адзінае палатно. Кампазітар зрабіў цікавыя аўтарскія выказванні паводле фальклору. Выконваўся цыкл сумесна Маладзёжным хорам Brevis Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў і жаночым хорам "Мелодыка" сталічнага музычнага каледжа імя М. Глінкі. Спявалі і сольна, прэзентаваўшы творы яшчэ аднаго сучаснага беларускага кампазітара Сяргея Бугасава з Ліды, а таксама замежных аўтараў.

Чуллівай, непадробленай шчырасцю гучалі галасы самых юных ўдзельнікаў з дзіцячых музычных школ мастацтваў №1 і №19 — узорных хароў "Тоніка" і Belcanto. Тут і прызнаная класіка харавой музыкі, і старадаўнія, і сучасныя творы. З нязпростымі выканальніцкімі задачамі дзеці справіліся паспяхова, падарыўшы тонкае адчуванне свята.

Завяршаў вечарыну Канцэртны хор каледжа імя М. Глінкі пад кіраўніцтвам дырэктара, прызнанага хормайстра і адданага папулярызатара айчыннай музыкі Аляксея Снітко. Творы ўрачыста манументальныя: узнёслая партытура "Багародзіцы" беларускага кампазітара Ганны Казловай, радасна-грандыёзны харавы фінал араторыі Л. Бетховена "Хрыстос на Маслічнай гары", жартаўлівая і вытанчаная частка "Ці-ры-ры" з харавой сімфоніі-дзейства "Перазвоны" В. Гаўрыліна.

Заключным акордам прагучала "Калядная фантазія" старшыні Беларускага саюза кампазітараў Алены Атрашкевіч, выкананая хорам каледжа разам з дзіцячымі калектывамі, — цікавы калаж з калядных і навагодніх песень розных краін. У кожнай ноце — пачуццё свята, прамяністай радасці. Не было ў гэты вечар ні ў зале, ні на сцэне чалавека, у сэрцы якога не запаліўся б водбліск Віфлеемскай зоркі, якая нясе людзям святло, мір і спакой.

Паліна КАПІТОНАВА

Афіша з 26 студзеня па 2 лютага

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20, тэл.: 8 017 3970163 (экскурсійнае бюро)

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Выстава **"Апалінарый Гараўскі. Да 190-годдзя з дня нараджэння". Да 28 студзеня.**
- Выстава **"«...На гонар і на хвалу Госпаду Богу...». Датаваныя і падпісныя творы сакральнага мастацтва Беларусі XVI—XIX стст.". Да 28 студзеня.**
- Выстава жывапісу народнага мастака Беларусі Гаўрыла Харытонавіча Вашчанкі (1928 – 2014) **"Палескі волат"**, прысвечаная 95-годдзю з дня нараджэння творцы. **Да 4 лютага.**
- Выстава **"Праваслаўныя святыні". Да 29 студзеня.**
- Экскурсіі: **"Самыя-самыя..." (6+), "Якога колеру зіма?" (6+), "Казкі Усходу" (10+), "Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+), "Партрэты даўнія мінулых пакаленняў..." (10+), "Пяць моў кахання" (16+), "Жаночы партрэт" (16+), "Мінск у музеі" (16+). Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а, тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Квэст **"Пошукі мінулага"**.
- Экскурсія **"Шлях мастака Валенція Ваньковіча"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Зборная інтэрактыўная праграма **"Мова веера". Праводзіцца заўсёды.**
- Праграма **"У свяцілішчы, дзе дыхае цень алівы". Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Мінскі р-н, Астрашыцка-Гарадоцкі с/с, в. Аколіца, вул. Іванаўская, 176, тэл.: 8 017 5074468

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Выстава майстра па бісерапляценні Веры Уладзіміраўны Занкевіч **"Па матывах ткацтва"**. У экспазіцыі прадстаўлены ўпрыгожанні з некалькіх калекцый, распрацаваных у перыяд дзейнасці аўтара – з 2003 па 2023 год. **Да 18 лютага.**
- Выстава з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.
- Майстар-клас **"Саломапляценне". Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Лялька-мотанка". Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Ткацтва". Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37, тэл.: 8 0222 650203, 8 0222 658800

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.**
- Выставачны праект **"Край белых буслоў. Вобраз Радзімы ў творах беларускіх мастакоў XX–XXI стст". Да 4 сакавіка.**

Падрабязней на сайце **artmuseum.by** альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800

УНП 100377771

МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

г. Магілёў, вул. Першамайская, 7,
тэл.: 8 0222 656604 (каса),
сайт: **mdrama.by**

• Horror у 2 дзеях **"Вій" (16+)**. Гастролі Палескага драматычнага тэатра. **26 студзеня ў 18.30.**
• Музычная казка ў 1 дзеі **"Брыдкае качаня" (0+)**. **27 студзеня ў 12.00.**
• Камедыя **"Рамантыкі" (12+). 27 студзеня ў 18.30.**
• Для сямейнага прагляду **"Усе хлапчукі – дурні!" (6+). 28 студзеня ў 12.00.**
• Вадэвіль у 2 дзеях **"Бяда ад далікатнага сэрца" (12+). 28 студзеня ў 18.30.**
• Гісторыя прыхільнасці ў 1 дзеі **"Прыйшоў мужчына да жанчыны" (18+). 31 студзеня ў 18.30.**
• Французская камедыя ў 2 дзеях **"Сем жанчын на шыі" (16+). 19 студзеня ў 18.30.**
• Трагедыя па матывах камедыі **"Дон Жуан" (16+). 2 лютага ў 18.30.**
• Казка **"Як стаць супергероем?" (0+). 3 лютага ў 18.30.**
• Сямейная камедыя ў 2 дзеях **"Мая жонка – манюка" (16+). 3 лютага ў 18.30.**
• Музычная казка **"Два клёны" (6+). 4 лютага ў 12.00.**
• Змешаная гісторыя кахання непатрэбных людзей у 2 дзеях **"Дурнічка і ЗЭК". 4 лютага ў 18.30.**

УНП 700184059

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Спектакль **"Паўлінка" (12+).** Галоўная сцэна. **31 студзеня ў 19.00.**
• Спектакль **"А зоры тут ціхія" (12+)**. Галоўная сцэна. **26 студзеня ў 19.00.**
• Спектакль **"Казка аб мёртвай царэўне" (6+).** Галоўная сцэна. **28 студзеня ў 11.30.**
• Спектакль **"Час жыцця" (12+).** Галоўная сцэна. **1 лютага ў 19.00**.
• Спектакль **"Жаніцьба" (12+)**. Галоўная сцэна. **28 студзеня ў 19.00**.
• Канцэрт **"Зімовы джаз" (0+)**. Галоўная сцэна.
• Спектакль **"Двор майго дзяцінства" (12+)**. Камерная сцэна. **2 лютага ў 19.00.**
• Музычнае прадстаўленне **"Музыка душы" (0+).** Камінная зала. **27 студзеня ў 19.00.**

УНП 100377901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Балет у 2 дзеях **"Шчаўкунок" (6+). 26 студзеня ў 19.00.**
• Опера ў 4 дзеях **"Аіда" (12+). 27 студзеня ў 18.00.**
• Балет у 2 дзеях **"Маленькі прынц" (12+). 28 студзеня ў 11.00.**
• Опера ў 2 дзеях **"Дзікае паляванне караля Стаха" (12+). 30 студзеня ў 19.00.**
• Балет у 3 дзеях **"Карсар" (12+). 31 студзеня ў 19.00.**
• Канцэрт **"Шэдэўры оперы" (12+)**. Камерная зала імя Л.П. Александроўскай. **31 студзеня ў 19.30.**

УНП 191081322

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2,
тэл.: 8 0212 669077 (каса)

• Казка ў 2 дзеях **"Марозка" (3+). 27 студзеня ў 11.00.**
• Музычная казка ў 2 дзеях **"Церам-церамок" (3+). 28 студзеня ў 11.00.**

УНП 300001869

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль
• Часовая экспазіцыя **"Таварыства перасоўных мастацкіх выстаў"**, г. Санкт-Пецярбург. Вялікая выставачная зала. **Да 10 сакавіка.**
• Выстава сучаснага скульптара Максіма Петруля **"4х4"**. **Да 16 лютага.**
• Часовая экспазіцыя **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны". Да 13 кастрычніка.**
• Экспазіцыя **"Цудатворная Жыровіцкая ікона Божай Маці ў камені"**. Аўтар праекта А. Папельскі. Малая выставачная зала. **Да 18 лістапада.**
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара". У складзе пастаяннай экспазіцыі.**
• Квэст **"Палацавыя таямніцы"**.
• Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны", "Нясвіж – здабытак сусветнай культуры", "Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа", "Шэдэўры калекцыі і ўнікальныя артэфакты музея-запаведніка «Нясвіж»"**.
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Аддзел экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)
• Часовая экспазіцыя твораў Андрэя Ждановіча **"Беларускі пейзаж". Да 31 студзеня.**

Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3)
Пастаянныя экспазіцыі
• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII – 1-й палове XIX стст.".**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX–XX стагоддзяў **"Культура часу"**. З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **"Безаблічны артэфакт", "Карта сямі каралеўстваў", "Музейны дэтэктыў", "Музейнае расследаванне"**.
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні", "Дзень нараджэння ў ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце **niasvizh.by**.

УНП 600207920

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі р-н,
Гродзенская вобл.,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Культурная акцыя **"Памятаць, каб не паўтарылася…"**, прымеркаваная да Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакосту. **27 студзеня.**
• Квэст **"Белы слон". 27 студзеня ў 15.30.**
• Часовая экспазіцыя **"Погляд у мінулае: мода, стыль і прыгажосць" (0+)**. Прадметы побыту, мэбля, мужчынскія і жаночыя аксесуары прадстаўнікоў вышэйшых слаёў грамадства XIX – пачатку XX стагоддзяў. Слановая зала. **Да 25 лютага.**
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
• Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка"**.
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце", "Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.", "Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.", "Печы з каробкавай кафлі XVI–XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў"**.

УНП 590201541

ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ ФІЛАРМОНІЯ

г. Віцебск, вул. Леніна, 69,
тэл. касы: 8 0212 368387,
сайт: **vitebsk-fil.by**

• Праграма **"Героі нашага часу" (3+)** у межах праекта "Філармонія – дзецям". **27 студзеня ў 11:00.**
• Музычныя сустрэчы для будучых мам **"Саткаць душу з нот" – сустрэча пятая: "Візуалізуем шчасце" (0+). 27 студзеня ў 16:00.**
• Праграма **"Братка Ліс і Братка Трус" (3+)** у межах праекта "Філармонія – дзецям". **28 студзеня ў 11:00**
• Дзіцячы мюзікл **"Залатое кураня" (3+)** у межах праекта "Філармонія – дзецям". **3 лютага ў 11:00**
• Музычна-гульнявая праграма **"Карамелька і Гарошынка ў інтэрнэце" (3+)** у межах праекта "Філармонія – дзецям". **4 лютага ў 11:00**

УНП 300149385

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Часовая выстава **"Адзінай памяці верныя"**, прысвечаная 80-годдзю з пачатку вызвалення Беларусі.
• Урок гісторыі ў музеі – унікальная паслуга, якая стане выдатнай альтэрнатывай класічным заняткам у школах і каледжах. Музейныя ўрокі праводзяцца па розных тэматыках, а іх напаўненне ўключае тэарэтычную і практычную частку, што дазваляе навучэнцам больш эфектыўна авалодаць новымі ведамі!

Прапанаваныя тэмы музейных урокаў:
1. "Вучыцца ў імя Перамогі" для вучняў I–IV класаў;
2. "Лясны карэспандэнт" для вучняў V–VIII класаў;
3. "Пачатак вызвалення Беларусі. Восень 1943 года" і "Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг." для вучняў IX–XI класаў.

Падрабязнасці на сайце **warmuseum.by**.

УНП 100235472

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2427814,
час працы: аўторак – нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выставачны праект **"Падарожжы Фёдара Конюхава". Да 28 студзеня.**

г. Мінск, вул. Некрасава, 3,
тэл.: 8 017 2350331,
час працы: серада – нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Персанальная выстава твораў Вадзіма Качана **"Ад піктарыялізму да канцэптуалізму". Да 11 лютага.**
• Выстава **"Пераадолене". Да 11 лютага.**
• Персанальная выстава твораў Івана Козела **"Іван Козел. Жывапіс". Да 18 лютага.**
• Выставачны праект **"Сузор'е вандроўніка". Да 18 лютага.**
• Выстава **"Моры рэальныя і выдуманыя. Беларускія літаратары на вакацыях". Да 18 лютага.**

УНП 192543414

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэлефоны: **8 017 3970163, 8 025 6677819**.

УНП 100377771

t.me/kultinfa

Карыстаецеся стыкерамі ў анлайн-ліставанні і хочаце папоўніць сваю калекцыю? Прапануем стыкерпак ад "Культуры"! Выказаць эмоцыі вам дапамогуць класікі беларускай літаратуры. Выбірайце самую трапную цытату — і здзіўляйце суразмоўцаў у Telegram!

2006 2010 2022

КУЛЬТУРА

Сайт: kultura-info.by
E-mail: kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА). Выдаецца на беларускай мове.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура":

Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактар аддзела — Віктар ГАУРЫШ.

Аглядальнікі рэдакцыі: Яўгенія ГАБЕЦ, Антон РУДАК, Ганна САКАЛОВА, Ілья СВІРЫН, Данііл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.

Рэдактар літаратурны — Мацвей ЗАЙЦАЎ.

Рэдактар мастацкі — Мікалай КАСЦЮКОЎ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефон: 8 017 2860797.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879.
Льготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %).
Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).

Рознічны кошт — па дамоўленасці.

* — матэрыял на правах рэкламы.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Падпісана ў друк 25.01.2024 у 16.00. Замова № 88. Наклад 3831.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

© "Культура", 2024.